Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

15 КРАСАВІКА 2023 г. СУБОТА

№ 72 (29952)




ВЯЛІКДЗЕНЬ... НА ВОСТРАВЕ 3



ЦУДАТВОРНЫЯ АБРАЗЫ БЕЛАРУСІ 3

# Свята вялікай радасці і духоўнага абнаўлення

*Праваслаўным хрысціянам Беларусі*

*Дарагія суайчыннікі!*

*Віншую вас са светлым Хрыстовым Уваскрэсеннем.*

*Шматмільённы праваслаўны свет адзначае сёння Вялікдзень — свята вялікай радасці, духоўнага абнаўлення і ўпэўненасці ў найлепшай будучыні.*

*Мы дакранаемся сэрцам да старажытных традыцый хрысціянства і, падобна папярэднім пакаленням, здзяйсняем добрыя справы, клапоцімся аб блізкіх, дапамагаем тым, хто мае патрэбу ў падтрымцы і спагадзе, выступаем у абарону міру і спакою для ўсіх нашых брацкіх народаў.*

*Спрадвечнае імкненне беларусаў да стварэння, глыбокая павага да святыняў, гатоўнасць захоўваць сваю веру з'яўляюцца трывалай асновай нашага адзінства і грамадскай згоды.*

*Няхай велікодныя ўрачыстасці сагрэюць вас цяплом хатняга агменю, надзеяй і любоўю.*

*Жадаю ўсім шчасця, здароўя і ўзаемаразумення.*

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

З першых вуснаў

## «БЕЛАРУСКАЕ ПРАВАСУДДЗЕ ДЫНАМІЧНА ЎДАСКАНАЛЬВАЕЦЦА»

### Аляксандр Лукашэнка ўручыў дзяржаўныя ўзнагароды суддзям Вярхоўнага Суда

**Сімвалічна, што высокія ўзнагароды з рук кіраўніка дзяржавы суддзі атрымалі напярэдадні знамянальнай для ўсёй судовай сістэмы даты — векавога юбілею Вярхоўнага Суда.**



Фота БелТА.

**Суддзя Вярхоўнага Суда Валянціна КРЫВАЯ ўзнагароджана медалём «За працоўныя заслугі».**

«Стагадовая гісторыя станаўлення і развіцця найвышэйшага судовага органа нашай дзяржавы багатая на падзеі, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Яна беражліва захоўвае памяць аб кіраўніках, суддзях Вярхоўнага Суда, многіх іншых яго работніках, якія аддалі ўсе сілы і веды служэнню закону. Некаторыя з іх не толькі вяршылі правасуддзе, але і ў гады Вялікай Айчыннай вайны са зброяй у руках абаранялі сваю Радзіму ад фашысцкага нашэсця. Вопыт, веды, грамадзянская мужнасць, адказнасць вашых папярэднікаў заўсёды дапамагалі нашай краіне правільна выбіраць шлях свайго развіцця».

Па словах Прэзідэнта, судовая сістэма Беларусі неаднойчы перажывала змены. «Дзякуючы вам, — удакладніў ён, звяртаючыся да суддзяў, адзначаных высокімі дзяржаўнымі ўзнагародамі. — Але глабальныя пераўтварэнні ў яе ўмацаванні звязаны з набыццём нашай краінай дзяржаўнага суверэнітэту. Многія з прысутных тут суддзяў былі ўдзельнікамі гэтага працэсу нашага рэфармавання».

«Дзяржава ўдзяляе сур'ёзную ўвагу судовай сістэме, зацікаўлена ў яе пастаянным развіцці, адзначае ўсе дасягненні і поспехі суддзейскага корпуса, — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка. — Узнагароджанне шэрагу суддзяў высокімі дзяржаўнымі ўзнагародамі з'яўляецца не толькі асаблівай прыкметай і павагай асабістых заслуг. Гэта ацэнка дзейнасці вашай прафесійнай супольнасці».

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што падзеі апошніх гадоў сталі яшчэ адным сур'ёзным выпрабаваннем на стойкасць і трываласць усёй судовай сістэмы. «Беларускія суды ўпершыню ў сучаснай гісторыі сутыкнуліся з беспрэцэдэнтным інфармацыйным і псіхалагічным ціскам, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — І гэты ціск нікуды не сышоў, ён працягваецца дагэтуль. Галоўнай мэтай усяго гэтага было дэстабілізаваць работу судоў, унесці дысбаланс у згуртаванасць суддзейскага корпуса».

СТАР. 2

## «Мы адзіныя ў жаданні забяспечыць у сваіх дзяржавах законнасць і парадак, абараніць інтарэсы грамадзян»

### Прэзідэнт Беларусі сустрэўся з кіраўнікамі вышэйшых судоў замежных краін

**На пачатку сустрэчы Аляксандр Лукашэнка засяродзіў увагу гасцей на тым, што іх візіт звязаны са знамянальнай датай для нашай краіны — 100-годдзем Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь. Тое, што гэтая падзея заўважана кіраўніцтвам вышэйшых судоў замежных дзяржаў, не можа не радаваць — у Беларусі высока цэняць дружалюбныя кантакты.**

Як адзначыў Прэзідэнт, прадставілася добрая нагода сустрэцца з найлепшымі людзьмі сферы юрыспрудэнцыі. «Ведаю, што ў кіраўніцтва вярхоўных судоў дрэнных не прызначаюць, — падкрэсліў ён. — І дзень урачысты, з іншага боку, выпадак прадставіўся — ёсць аб чым пагаварыць».

### «Сінхронна і ўзгоднена»

Прэзідэнт нагадаў, што краіны цесна супрацоўнічаюць у розных сферах дзейнасці, у тым ліку ў рамках міжнародных абавязацельстваў па лініі Садружнасці Незалежных Дзяржаў, Саюзнай дзяржавы, Еўразійскага эканамічнага саюза. «Мы актыўна развіваем сваю прысутнасць на пляцоўках Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Само жыццё пацвярджае абгрунтаванасць памкненняў народаў былых савецкіх рэспублік да больш цеснага ўзаемадзеяння. Асабліва гэта актуальна ў наш вельмі няпросты час».

Пры гэтым беларускі лідар звярнуў увагу на тое, што мы адзіныя ў жаданні забяспечыць у сваіх дзяржавах законнасць і парадак, абараніць інтарэсы грамадзян. Па яго перакананні, візіт у Мінск кіраўнікоў вышэйшых судоў замежных дзяржаў паслужыць далейшаму развіццю прафесійнага супрацоўніцтва. «Свята святам, але нашы абавязкі з нас ніхто не здымаў», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт упэўнены: многія пераўтварэнні ў сферы судовай дзейнасці мы можам праводзіць сінхронна і ўзгоднена. «Наша краіна заўсёды адкрыта для дыялогу, — акцэнтаваў увагу ён. — Павінен вам сказаць, што мы вельмі сур'ёзна назіраем за вамі, за вашымі новаўвядзеннямі ў вашых судах і, робячы пэўныя крокі пры рэфармаванні нашай судовай сістэмы, глядзім, каб не забегчы наперад і не сысці ў бок ад вас».

У той жа час кіраўнік дзяржавы запэўніў, што, калі прадстаўнікам судовай сістэмы краін Садружнасці неабходна будзе нешта зрабіць на дзяржаўным або міждзяржаўным узроўнях, мы гатовы падтрымаць і рэалізаваць усе канструктыўныя прапановы. «Мы ўжо зрабілі правільны крок ва ўмацаванні ўзаемадзеяння, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Па ініцыятыве нашага Вярхоўнага Суда створаны Савет старшынь вярхоўных судоў дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Гэта дазволіць скаардынаваць нашы падыходы ў сферы правасуддзя».

СТАР. 2

Сацыяльны праект «Дажынкі»

## ВЯЛІКАЯ БУДАЎНІЧАЯ ПЛЯЦОЎКА

### У Ганцавічах поўным ходам ідзе падрыхтоўка да абласнога свята ўраджаю

**Ганцавічы цяпер нагадваюць вялікую будаўнічую пляцоўку. На вуліцах і плошчах шчыруюць людзі ў рабочым адзенні, працуе тэхніка. Здымаецца старое, укладваецца свежае асфальтавае пакрыццё, новая тратуарная плітка, абнаўляюцца фасады будынкаў, вядзецца рамонт унутры. Гэта значыць, што ў адзін з першых выхадных верасня Брэстчына адсвяткуе дажынкі ў прыгожым аднаўленым райцэнтры.**

### Вуліцы і дарогі

Прайшло дванаццаць гадоў, як у Ганцавічах вялася маштабная работа па добраўпарадкаванні. У 2011 годзе горад рыхтаваўся да Дня беларускага пісьменства. Тады таксама ўдалося шмат зрабіць, палескі райцэнтр прыкметна памаладзеў. Гэтым разам аблвыканкамам зацверджана вялікая праграма падрыхтоўкі да восеньскага фестывалю-кірмашу. На фінансаванне мерапрыемстваў праграмы з абласнога бюджэту прадугледжана выдзеліць каля 16 мільёнаў рублёў.

СТАР. 3

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Прэзідэнт Бразіліі прапанаваў адмовіцца ад долара ў глабальным гандлі



На сайце прэзідэнта Бразіліі Луіса Інасіу Лулы да Сілвы апублікавана заява, у якой кіраўнік дзяржавы заклікае стварыць альтэрнатыўную долару валюту для разлікаў, паведаміла РІА «Навіны». Падчас цырымоніі ўступлення на пасаду новага кіраўніка банка развіцця БРІКС Дзілмы Русеф прэзідэнт Бразіліі заявіў аб тым, што міждзяржаўнае аб'яднанне можа мець валюту, з дапамогай якой можна фінансаваць гандлёвыя адносіны паміж Бразіліяй і Кітаем, паміж Бразіліяй і іншымі краінамі БРІКС. Паводле яго слоў, зрабіць гэта будзе няпроста, бо свет залежыць ад адной валюты. Кіраўнік Бразіліі мяркуе, што дзяржавы могуць карыстацца ўласнай валютай для разлікаў. Як вядома, пасля ўступлення ў студзені на пасаду прэзідэнта Лула да Сілва вылучыў прапанову аб увядзенні адзінай валюты МЕРКАСУР для выкарыстання пры разліках унутры банка. Ён удакладніў таксама, што такія абмеркаванні вядуцца і ў БРІКС. Раней цэнтрабанк Бразіліі абвясціў аб заключэнні пагаднення з кітайскім ЦБ аб прамой канвертацыі валют дзвюх краін пры здзяйсненні камерцыйных аперацый без пасрэдніцтва долара.

ISSN 1990 - 763X

### У Фларыдзе ўведзены надзвычайны рэжым з-за паводкі

Губернатар Фларыды Рон Дэсантыс увёў рэжым надзвычайнай сітуацыі ў акрузе Браўард з-за паводкі, якая выклікана моцнай залевай. Пра гэта паведаміла ТАСС са спасылкай на акаўнт кіраўніка рэгіёна ў «Твітэры». Найбольш пацярпеў ад стыхіі буйны горад Форт-Лодэрдэйл, дзе аказаліся падтопленымі дамы, там закрыты для руху дарогі і мясцовы аэрапорт. На ліквідацыі наступстваў задзейнічаны экстранныя службы. Насельніцтву пацярпелых раёнаў рэкамендавана прытрымлівацца ўказанняў улад. Метэаролагі заклікаюць людзей адмовіцца ад паездак і схавацца на ўзвышшах. Паводле звестак The New York Times, за 24 гадзіны ў некаторых раёнах выпала больш чым 600 міліметраў ападкаў. Паводле ацэнкі метэаролагаў, гэта вельмі рэдкая для штата з'ява, якая здараецца прыкладна раз на тысячу гадоў.



### Улады Тайланда прыгразілі турыстам турмой за ўвоз садавіны



У Тайландзе турыстам можа пагражаць штраф ці турэмнае зняволенне за ўвоз у краіну садавіны. З такім папярэджаннем выступіла Міністэрства сельскай гаспадаркі Тайланда, паведаміла РІА «Навіны». Адзначаецца, што штраф за правоз садавіны можа скласці 580 долараў. Больш суровае пакаранне — турэмнае зняволенне тэрмінам на адзін год. Паводле даных Міністэрства сельскай гаспадаркі Тайланда, пакаранне пагражае ў выпадку ўвозу ў краіну свежай садавіны без фітасанітарнага сертыфіката. Гэтае правіла датычыцца не толькі замежных турыстаў, але і грамадзян Тайланда, якія вяртаюцца ў краіну з замежных паездак.

## КОРАТКА

- **У Беларусі запаволіўся прырост сярэдняй шырокай грашовай масы і палепшылася яе структура.**
- Раннія яравыя ў Беларусі пасеялі амаль на 40 працэнтах плошчаў.



- **Футбалісты «Нафтана» і «Мінска» адкрыюць праграму чацвёртага тура чэмпіянату Беларусі.**
- На выстаўцы ТІБА-2023 прадставяць больш за 260 экспанентаў.




- **З рэзервовага фонду Прэзідэнта выдзеляць Br1,5 млн на падтрымку адоранай моладзі.**

Агульны клопат

## ПРЫБІРАННЕ ЛЕСУ, ГАРАДОЎ, ДАРОГ

### Як Беларусь добраўпарадкоўваецца вясной

**Навядзенне чысціні і прыгажосці ды азеляненне паўсюль — ад мегаполіса да аграгарадка — задача, якая штогод паўстае перад краінай адпаведна з Рэспубліканскім планам па навядзенні парадку на зямлі. Сёлета ў рамках вясенняга месячніка па навядзенні парадку на зямлі ў Беларусі праводзяцца традыцыйныя суботнікі, а таксама экалагічная кампанія «Мірная стваральная праца на карысць чыстай і зялёнай краіны». Мяркуецца, што ў рэспубліканскім суботніку, які адбудзецца 22 красавіка, возьмуць удзел каля трох мільёнаў беларусаў, а грашовы набытак складзе больш за 12 мільёнаў рублёў. Паколькі суботнік прымеркаваны да Года міру і стваральнай працы, падчас мерапрыемства плануецца добраўпарадкаваць і навесці парадак на мемарыяльных комплексах і месцах воінскай славы Вялікай Айчыннай вайны.**

### НА ЗЯМЛІ І ВАДЗЕ

Навядзенне парадку на зямлі — не толькі дзяржаўная палітыка, але і ўклад кожнага беларуса ў агульную справу, падкрэслілі эксперты, якія расказалі, як праходзіць прыборка краіны. Сёлета Рэспубліканскі план па навядзенні парадку на зямлі ўключае каля 110 мерапрыемстваў, скіраваных на добраўпарадкаванне і ўтрыманне тэрыторый населеных пунктаў, сельскагаспадарчых аб'ектаў, палос адводу аўтамабільных і чыгуначных дарог, месцаў пахавання, тэрыторый ляснога фонду. У пералік работ уваходзіць і падтрыманне ў належным стане асабліва ахоўных прыродных тэрыторый: запаведнікаў, заказнікаў, помнікаў прыроды.



СТАР. 3

# «БЕЛАРУСКАЕ ПРАВАСУДДЗЕ ДЫНАМІЧНА ЎДАСКАНАЛЬВАЕЦЦА»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Па словах Прэзідэнта, прысутныя на цырымоніі ўручэння дзяржаўных узнагарод годна вытрымалі гэтыя выпрабаванні, засталіся верныя закону і прафесіі. Кіраўнік дзяржавы выказаў удзячнасць гасцям Палаца Незалежнасці, а таксама ў іх асобе ўсім суддзям Беларусі за патрыятызм, стойкасць і вытрымку, якую вы праявілі.

Прэзідэнт расказаў суддзям, аб чым гаварыў падчас сустрэчы з кіраўнікамі вышэйшых судоў замежных дзяржаў. «Дзелячыся вопытам з кіраўніцтвам судоў, якія да нас прыехалі, я ім сказаў, што мы нічога не ламалі, — перадаў дэталі сустрэчы беларускі лідар. — Гэта нашы прынцыпы асноўныя. Мы ўсё ўдасканальвалі, мы памятаем, што стаім на плячах гігантаў. І тая спадчына, якая нам дасталася ад савецкага правасуддзя, што мы, вынаходзячы, атрымлівалі першыя гады нашага суверэнітэту і незалежнасці, мы спакойна ўдасканальвалі, рэфармуючы нашу судовую сістэму. Але гэта не мая заслуга, як там сёння казалі. Гэта заслуга перш за ўсё ваша. Вы заўсёды ініцыіравалі перад Прэзідэнтам тыя ці іншыя навацыі, новаўвядзенні. А я ніколі вам не адмаўляў». Такім чынам, беларусы прайшлі тры этапы рэфармавання судовай сістэмы.

«Пры ўсёй нашай «дыктатуры» з вамі ў гэтым плане з 52 або 54 тысяч «сядзельцаў» на пачатак майго прэзідэнцтва сёння 24 — вось і ўся «дыктатура», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — Гэта на два разы скарачэнне за той перыяд, які мы з вамі прайшлі. Гэта сведчыць аб тым, што без залішняй гуманізацыі, як гэта прынята ў вас казаць, мы зрабілі гуманнай краіну і гуманным наша правасуддзе».



Фота БелТА.

Кіраўнік дзяржавы абсалютна перакананы, што прадстаўнікі судовай сістэмы і далей будуць абараняць сваю краіну, сваю Радзіму. «Для вас Радзіма, як і для мяне, яна вялікая, яна ўся, — удакладніў ён, звяртаючыся да судовага корпуса. — Ад усёй душы я жадаю вам здароўя, міру, дабрабыту, далейшых поспехаў у вашай прафесійнай дзейнасці. Няпростай».

Прэзідэнт таксама заўважыў, што пры рэфармаванні судовай сістэмы новаўвядзенні спачатку замацоўваліся і апрабаваліся на ўзроўні нарматыўных прававых актаў. «А калі мы зразумелі, што тыя навацыі, якія мы прымянялі і апрабавалі праз указы і законы, мы пайшлі на радыкальнае рэфармаванне нават не судовай сістэмы, а сістэмы ўлады ў Рэспубліцы Беларусь, вывеўшы вас на самы высокі ўзровень, — нагадаў кіраўнік дзяржавы. — Сёння ўжо Прэзідэнт не мае тых паўнамоцтваў, якія меў да змяненняў у Канстытуцыю. Вы будзеце выбірацца прадстаўнікамі народа на Усебеларускім народным сходзе. І гэта вельмі сур'ёзны крок. Ці перажываю я ў сувязі з гэтым? Так, крыху хвалююча, таму што судовая галіна ўлады ёсць судовая. Але я ўпэўнены, што мы справімся. Мы ўжо не тыя, што былі 20—25 гадоў таму. Мы справімся!»

Аляксандр Лукашэнка падзяліўся, што ён вельмі хацеў бы, каб назапашаны вопыт, веды і мудрасць паслужылі нашай Айчыне, каб мы стаялі на абароне правасуддзя і справядлівасці, каб нашы дзеці і ўнукі адчувалі сябе абароненымі, ганарыліся сваёй краінай.

Старшыня Вярхоўнага Суда Валянцін Сукала ад імя суддзяў усёй краіны падзякаваў Прэзідэнту за тую ўвагу, якую ён удзяляе судовай сістэме краіны. Па словах Старшыні Вярхоўнага Суда, кожны новы этап судовага будаўніцтва сёння канцэптуальна абмяркоўваецца кіраўніком дзяржавы з удзелам судзейскай супольнасці, да меркавання якой Прэзідэнт заўсёды прыслухоўваецца. «У нашай краіне створана сучасная, вельмі ўстойлівая і зразумелая судовая сістэма, якая здольна вытрымаць сёння сучасныя выклікі, пагрозы, якая забяспечыць судовую абарону правоў нашых грамадзян і годны ўзровень забеспячэння грамадскага правапарадку. Увесь судзейскі корпус краіны правільна разумее задачы, якія стаяць перад ім, разумее ўзровень сваёй адказнасці і зробіць усё дзеля таго, каб у далейшым забяспечыць правапарадак і законнасць у нашай краіне». З нагоды юбілейнай даты Валянцін Сукала перадаў у падарунак кіраўніку дзяржавы эксклюзіўны экземпляр спецыяльнага выдання, прысвечанага гісторыі беларускага правасуддзя.

**Вераніка КАНЮТА.**

## У тэму

**Аднымі з першых з дзяржаўнымі ўзнагародамі суддзяў Вярхоўнага Суда павіншавалі і карэспандэнты «Звязды».**

Суддзя судовай калегіі па крымінальных справах Вярхоўнага Суда Валянціна КРЫВАЯ атрымала з рук кіраўніка дзяржавы медаль «За працоўныя заслугі». Суддзя прызналася, што ўручэнне ўзнагароды — вялікі гонар для яе: «У гэты важны і ўрачысты дзень ад сябе і ўсіх сваіх калег хачу сказаць, што нам вельмі прыемна, што наша праца ацэнена такімі высокімі ўзнагародамі. Мы і далей будзем імкнуцца аддаваць усе свае веды, вопыт, талент на карысць нашай Радзімы, для яе росквіту».

Судовы стаж Валянціны Крывой складае практычна 28 гадоў. «Работа суддзі няпростая заўсёды, бо гэта лёсы людзей, — лічыць яна. — Калі грамадзянскае судаводства, то гэта спрэчка. З катэгорыяй людзей, якія нечым незадаволены, складана працаваць ва ўсе часы. Нам дапамагае ўзаемная падтрымка, цярпенне, уменне спраўляцца са складанасцямі і спакой».

Суддзя Вярхоўнага Суда Андрэй АЛЕШЧАНКА ўзнагароджаны Падзякай Прэзідэнта Беларусі. Суддзя прызнаўся, што адчувае самыя яркія эмоцыі: «Акрамя таго, што гэта ацэнка пэўных асабістых дасягненняў і заслуг, перш за ўсё гэта высокая ацэнка Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь. У цяперашні час Вярхоўны Суд забяспечвае той узровень правасуддзя, у якім маюць патрэбу наша дзяржава, наша грамадства».

Па словах Андрэя Алешчанкі, пасля апошняй судовай рэформы стала прасцей працаваць не толькі судоваму корпусу, але і ўдзельнікам судаводства. «Прычым не толькі прафесійным (адвакатам, пракурорам, юрыстам юрыдычных службаў прадпрыемстваў), але і простым грамадзянам, — удакладніў ён. — Гэта і лічбавізацыя, і больш шырокі доступ людзей да правасуддзя. А выніку тых рэформаў, якія ў нас будуць, яшчэ больш павысяць гэты ўзровень. Гэта і тыя змяненні, якія ўнесены ў Крымінальна-працэсуальны кодэкс і ўступяць у сілу ў ліпені гэтага года, і Кодэкс грамадзянскага судаводства (неўзабаве будзе разгледжаны ў другім чытанні), які істотна пашырыць магчымасці бакоў і па звароце ў суд, і па абароне сваіх правоў і законных інтарэсаў, і па абскарджанні судовых пастаноў. Будзе значна ўзмоцнены прымірэнчы вектар правасуддзя. Усё гэта забяспечыць высокую яго эфектыўнасць і рэзультатыўнасць».

# «Мы адзіныя ў жаданні забяспечыць у сваіх дзяржавах законнасць і парадак, абараніць інтарэсы грамадзян»

### «Паслядоўна і абдумана»

Асаблівы інтарэс, па меркаванні Прэзідэнта, уяўляе абмен вопытам у галіне судовага будаўніцтва. «Як вы ведаеце, Беларусь пайшла па шляху паслядоўнага ўдасканалення структуры судовай улады. Мы адракліся ад спроб штосьці ламаць, разбураць, — нагадаў Аляксандр Лукашэнка. — Мы разумеем, што стаім на плячах гігантаў. Да нас вельмі многае зроблена судовым будаўніцтвам. Мы гэтым шляхам ішлі, удасканальваліся. Мы рабілі ўсё абдумана, без татальнага перайманне непатрэбнага нам замежнага досведу».

Кіраўнік дзяржавы паведаміў, што ў Беларусі праведзена некалькі этапаў судова-прававой рэформы. «Судовыя пераўтварэнні знайшлі сваё адлюстраванне пасля пэўных выпрабаванняў, якія мы праводзілі на заканатворчым узроўні, — у нашай Канстытуцыі, — нагадаў Аляксандр Лукашэнка. —

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



Фота БелТА.

Ведаем, што і ў вас адбываюцца працэсы судовага рэфармавання. Нам цікавыя вашы дасягненні і гатовы падзяліцца сваім вопытам».

Прэзідэнт Беларусі падкрэсліў, што, пастаянна ўдасканальваючы судовую сістэму, удзяляючы вялікую ўвагу будаўніцтву, мы спачатку апрабавалі ўсё на ўзроўні законаў і падзаконных актаў. «А потым, калі пераканаліся ў тым, што гэта кладзецца на нашу грэшную зямлю, мы замацавалі гэтыя кірункі, гэтыя пытанні ў нашай Канстытуцыі, папраўкі ў якую мы нядаўна прынялі», — рэзюмаваў кіраўнік дзяржавы.

### «Беларускі вопыт правасуддзя цікавы для замежных партнёраў»

Старшыня Вярхоўнага Суда Беларусі Валянцін Сукала паведаміў, што створаны ў канцы 2022 года па ініцыятыве беларускага боку Савет старшынь вярхоўных судоў краін СНД ужо пачаў актыўную працу. Рэспубліка Беларусь з'яўляецца ў ім сузаснавальнікам. «Сёння, калі дэвальвуюцца многія нормы міжнароднага права, калі ламаюцца і знішчаюцца міжнародныя прававыя інстытуты, нашы зносіны ў рамках такога савета з'яўляюцца вельмі і вельмі актуальнымі, — падкрэсліў Валянцін Сукала. — Асноўныя тэмы такога ўзаемадзеяння — гэта стан нашых судовых сістэм, шляхі і напрамкі іх далейшага развіцця».

Па словах Старшыні Вярхоўнага Суда, беларускі вопыт і наша нацыянальная мадэль правасуддзя маюць свае асаблівасці і могуць быць цікавымі для замежных партнёраў. «У нашай краіне завершаны чарговы, ужо трэці, этап судова-прававой рэформы, у ходзе якога мы рэалізавалі ўсе асноўныя структурныя і функцыянальныя пераўтварэнні ў судовай сістэме, якія планавалі, — адзначыў ён. — Канстытуцыйны рэферэндум, што адбыўся, і ўнесеныя змяненні ў Асноўны Закон Рэспублікі Беларусь ужо на самым высокім заканадаўчым узроўні ўзмацнілі асноўныя прынцыпы будавання і функцыянавання судовай сістэмы».

«Высокі статус Вярхоўнага Суда ўпершыню замацоўваецца на самым высокім канстытуцыйным узроўні, з адначасовым павышэннем статусу і гарантый для суддзяў Вярхоўнага і Канстытуцыйных судоў, — звярнуў увагу Валянцін Сукала. — Перадача Вярхоўнаму Суду ўсіх функцый судовага адміністравання і забеспячэння адзінай судовай сістэмы значна палепшыць усе віды матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння судоў, створыць добрыя ўмовы для работы ўсіх суддзяў нашай судовай сістэмы».

**Вераніка КАНЮТА.**

Парламенцкі дзённік

# Экалогія — прыярытэт дзяржаўнай палітыкі

**Аб гэтым заявіла Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА падчас 55-га пленарнага пасяджэння МПА СНД**

**13—14 красавіка ў Таўрычаскім палацы Санкт-Пецярбурга праходзіла вясновая сесія Міжпарламенцкай асамблеі краін СНД. На пленарным пасяджэнні асноўнай тэмай было заканадаўства ў сферы экалогіі. Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Наталля Качанава ў сваім выступленні прадставіла беларускую пазіцыю па гэтым пытанні.**

Паводле яе слоў, глабальныя працэсы перабудовы светаўладкавання закранулі і прыродаахоўную сферу: «У міжнародных адносінах робяцца спробы дапаўнення галоўных сэнсаў глабалізацыі — эканамічных і ваенна-палітычных — экалагічнымі. У сувязі з гэтым «экалагізацыя» нацыянальных эканомік выкарыстоўваецца ў якасці інструмента барацьбы з канкурэнтамі на сусветным рынку. Набірае абароты экалагічны прэсінг нараўне са «звыклымі» палітычнымі і эканамічнымі санкцыямі. Па сутнасці, нівеліруюцца шматгадовыя намаганні міжнароднай супольнасці ў сферы экалогіі».

У такой сітуацыі, заўважыла Наталля Качанава, экалагічнае развіццё Садружнасці бачыцца не ў папулізме, які шмат у чым уласцівы ЗША і так званаму калектыўнаму Захаду, а ў рэальнай абароне прыроднага набытку. «Наша першачарговая задача — заканадаўчае забеспячэнне ўкаранення на практыцы сучасных прынцыпаў экалагічнай палітыкі Садружнасці», — адзначыла яна.

Парламентарыі краін СНД павінны сказаць тут сваё важкае слова, лічыць спікер Савета Рэспублікі. Не толькі прыняццем выверaных профільных законаў. «Не менш значным павінен быць уклад парламентарыяў у выкананне паслядоўнага, рашучага і безумоўнага забеспячэння экалагічнай бяспекі тэрыторыі СНД і насельніцтва нашых краін. І ў гэтых пытаннях наш голас павінен гучаць пераканаўча», — сказала Наталля Качанава. У гэтым кантэксце выклікаюць занепакоенасць факты размяшчэння біялабараторый і іншых экалагічна небяспечных аб'ектаў у непасрэднай блізкасці ад граніц нашых дзяржаў, контрпрадукцыйная санкцыйная палітыка, эканамічны, энергетычны і харчовы крызіс, які нарастае ў шэрагу краін свету. Наталля Качанава прывяла ў прыклад сітуацыю на граніцы з Польшчай і Прыбалтыйскімі краінамі: «Краінамі так званага калектыўнага Захаду парушаны ўсе міжнародныя экалагічныя канвенцыі па ўнікальным, сусветнага значэння, прыродаахоўным комплексе «Белавежская пушча» — польскім бокам узведзена раздзяляльная бетонная сцяна. Уздоўж граніц з Беларуссю Латвіяй і Літвой устаноўлены ў тры рады «спіралі Бруна». Кожны дзень гінуць жывёлы, якія мігрыруюць. А ў асяроддзі вельмі актыўных у свой час «абаронцаў прыроды» на Захадзе — цішыня, нягледзячы на нашы неаднаразовыя звароты».

Наталля Качанава запэўніла прысутных, што экалогія традыцыйна ўваходзіць у лік прыярытэтных кірункаў дзяржаўнай палітыкі Беларусі. Паводле яе слоў, наш Прэзідэнт дакладна вызначыў канцэптуальныя падыходы беларускай дзяржавы да прыроднай спадчыны: «Прырода — гэта абсалютны прыярытэт. Гэта прыярытэт прыярытэтаў. Ёсць прырода — ёсць жыццё. Няма прыроды — няма жыцця». «Наша краіна з'яўляецца ўдзельніцай большасці універсальных і рэгіянальных прыродаахоўных пагадненняў, актыўна ўзаемадзейнічае па пытаннях стварэння міжнароднай прававой сістэмы ў гэтай галіне, — паведаміла Наталля Качанава. — На нацыянальным узроўні сфарміравана адпаведная заканадаўчая база, прыняты стратэгіі ў галіне аховы навакольнага асяроддзя, развіцця геалагічнай галіны і інтэнсіфікацыі рацыянальнага асваення мінеральна-сыравіннай базы. Дакладна выверанья і паслядоўныя крокі дзяржавы ў сферы экалогіі і прыродакарыстання дазваляюць захоўваць значную частку прыродных месцапражыванняў у першародным выглядзе і паспяхова забяспечваць экалагічны дабрабыт асвоеных тэрыторый. У сілу гэтага Беларусь выгадна адрозніваецца прыроднай унікальнасцю ў рамках, як мінімум, еўразійскай экалагічнай сістэмы. Мы па праве можам ганарыцца дасягненнямі ў галіне навядзення парадку на зямлі, водаачысткі, развіцця аднаўляльнай энергетыкі і электратранспарту, укаранення ў эканоміку нізкавугляродных і энергаэфектыўных тэхналогій. Выбудавана і паспяхова функцыянуе сістэма лесаразвядзення і лесааднаўлення. Ліквідуюцца дысбалансы ў правядзенні меліярацыйных мерапрыемстваў. На навуковай аснове захоўваюцца і аднаўляюцца балотныя комплексы — лёгкія Еўропы».

У Беларусі напрацаваны сур'ёзны вопыт аднаўлення тэрыторый, якія пацярпелі ад радыеактыўнага забруджвання ў выніку аварыі на Чарнобыльскай АЭС, акцэнтавала ўвагу Наталля Качанава. «Сёння яны актыўна выкарыстоўваюцца для прасоўвання экалагічнай адукацыі і навукі, «зялёнай» энергетыкі і іншых грамадска карысных мэт, — сказала яна. — Нашай краінай пройдзены асаблівы шлях па развіцці мірнага атама. Беларуская АЭС — не проста крыніца таннейшай і рэсурсазберагальнай электраэнергіі. Гэта экалагічны выбар, арыентаваны на стрымліванне кліматычных змен і вырашэнне праблем забруджвання навакольнага асяроддзя. А колькі было крытыкі ад нашых нядобразычліўцаў! Але сёння многія з іх плануюць рэалізаваць такія праекты».

«Уласцівая тэрыторыям нашых краін прыродная ўнікальнасць абавязвае нас дзейнічаць на доўгатэрміновую перспектыву. Мэта пабудовы экалагічнага міждзяржаўнага аб'яднання можа стаць часткай сучаснай палітыка-ідэалагічнай платформы Садружнасці Незалежных Дзяржаў», — рэзюмавала Наталля Качанава.

**Паводле прэс-службы Савета Рэспублікі.**


## Извещение об открытом аукционе по продаже права на размещение средства рекламы, в том числе средства наружной рекламы, на государственном недвижимом имуществе в г. Гродно 16 мая 2023 года

| № п/п | Адрес места и срок размещения средства наружной рекламы | Тип технического средства | Количество конструкций (единиц) | Количество сторон (плоскостей) | Начальная цена, руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | пр-т Космонавтов, территория, прилегающая к транспортному кольцу (над Большим объездным кольцом), сроком на 3 года | Рекламная щитовая односторонняя конструкция (3 х 6 м) № 1 с подсветкой | 1 | 1 | 419,58 | 419,58 |
| 2 | пр-т Космонавтов, территория, прилегающая к транспортному кольцу (над Большим объездным кольцом), сроком на 3 года | Рекламная щитовая односторонняя конструкция (3 х 6 м) № 2 с подсветкой | 1 | 1 | 419,58 | 419,58 |
| 3 | ул. Пучкова, территория, прилегающая к зданию № 47, сроком на 3 года | Рекламные флаговые конструкции (3 шт.) (3 х 1 м) | 3 | 3 | 209,79 | 209,79 |
| 4 | ул. Гагарина, территория, прилегающая к жилому дому № 19, сроком на 3 года | Рекламный двусторонний световой лайтпостер (1,2 х 1,8 м) х 2 | 1 | 2 | 75,52 | 75,52 |
| 5 | ул. Островского, территория, прилегающая к зданию № 3, сроком на 3 года | Рекламный двусторонний световой лайтпостер (1,2 х 1,8 м) х 2 | 1 | 2 | 75,52 | 75,52 |
| 6 | ул. Маслакова, прилегающая территория, сроком на 3 года | Рекламный двусторонний световой пилон (6,0 х 1,0 м х 2 ст) | 1 | 2 | 319,68 | 319,68 |
| 7 | ул. Суворова, территория, прилегающая к зданию № 256, сроком на 3 года | Рекламный двусторонний световой пилон (5,65 х 1,5 м) | 1 | 2 | 451,82 | 451,82 |
| 8 | пр-т Космонавтов, путепровод со стороны ул. Белуша, сроком на 5 лет | Настенная рекламная конструкция № 1 с подсветкой на путепроводе (12 х 1,5 м) | 1 | 1 | 251,75 | 251,75 |
| 9 | пр-т Космонавтов, путепровод со стороны ул. Белуша, сроком на 5 лет | Настенная рекламная конструкция № 2 с подсветкой на путепроводе (12 х 1,5 м) | 1 | 1 | 251,75 | 251,75 |
| 10 | пр-т Космонавтов, путепровод со стороны ул. Карского, сроком на 5 лет | Настенная рекламная конструкция № 3 с подсветкой на путепроводе (12 м х 1,5 м) | 1 | 1 | 251,75 | 251,75 |
| 11 | пр-т Космонавтов, путепровод со стороны ул. Карского, сроком на 5 лет | Настенная рекламная конструкция № 4 с подсветкой на путепроводе (12 х 1,5 м) | 1 | 1 | 251,75 | 251,75 |
| 12 | пл. Советская, территория, прилегающая к зданию № 6, сроком на 7 лет | Мультимедийная рекламная конструкция (рекламный светодиодный экран) (6,0 х 3,0 м) | 1 | 1 | 314,69 | 314,69 |

Аукцион состоится **16 мая 2023 года** в 12.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, актовый зал.

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, телефоны: 8 (0152) 62 60 55, 60 60 56

Задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению не позднее **11 мая 2023 года** (в случае участия в торгах в отношении нескольких лотов задаток вносится для каждого из предметов аукциона) на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 Гродненское областное управление № 400 ОАО АСБ «Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY2X, УНП 590727594, код назначения платежа 40901, получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости».

Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение пяти рабочих дней со дня проведения аукциона обязан перечислить на расчетный счет, указанный в протоколе о результатах торгов, сумму средств, за которую продан предмет торгов, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору торгов затраты на их организацию и проведение.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина 2/1, кабинет № 117, в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 **с 17 апреля по 11 мая 2023 года**.

Заявление на участие в аукционе подается с приложением следующих документов: заверенная банком копия платежного документа о внесении суммы задатка на расчетный счет организатора торгов; копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя; эскиз средства наружной рекламы, выполненный в цвете на бумажном носителе в формате А4 или электронном носителе. Физическим лицом, в том числе индивидуальным предпринимателем, представляется документ, удостоверяющий личность; представителем физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица – оригинал документа, подтверждающего его полномочия, и документ, удостоверяющий личность.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке проведения торгов на право размещения средств рекламы на недвижимом имуществе, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 7 июля 2021 г. № 395. До начала аукциона его участники проходят регистрацию (в т. ч. доводится информация о затратах на организацию и проведение аукциона). Аукцион проводит аукционист, определяемый организатором торгов. Аукцион начинается с оглашения аукционистом правил проведения аукциона, начальной цены, шага аукциона. Шаг аукциона: от 5 до 15 процентов от предыдущей цены предмета аукциона.

Не допускается продажа предмета аукциона по начальной цене. Аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимет только один участник. Аукционист трижды называет цену, по которой продан предмет аукциона, и объявляет о продаже данного предмета аукциона, а также сообщает номер участника, выигравшего аукцион по данному предмету аукциона, который является победителем аукциона. Аукцион по конкретному предмету аукциона признается несостоявшимся, о чем комиссией составляется протокол о признании аукциона несостоявшимися, если заявление на участие в нем подано только одним участником, или для участия в аукционе не было подано ни одного заявления, или на аукцион явился один из участников, или ни один из участников не явился на аукцион.

Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником либо для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Для получения разрешения рекламораспространитель (победитель аукциона) представляет в Гродненский городской исполнительный комитет заявление и иные документы, предусмотренные в регламенте административной процедуры по получению разрешения на размещение средства наружной рекламы, не позднее 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах торгов.

Гродненский городской исполнительный комитет и рекламораспространитель (победитель аукциона) в течение 10 рабочих дней со дня регистрации заявления заключают договор на размещение средства наружной рекламы, в соответствии с которым победителю аукциона предоставляется право на использование городской среды в рекламных целях.

Рекламораспространитель (победитель аукциона):

- несет ответственность за несущую способность, монтаж и эксплуатацию средства наружной рекламы, и разрабатывает техническую документацию на конструкцию. Монтаж средства наружной рекламы, осуществляет из элементов заводского изготовления в соответствии с действующими строительными и нормативно-техническими требованиями;

- после окончания размещения средства наружной рекламы обязан демонтировать рекламную конструкцию (наземную часть и фундамент), восстановить газонное и/или тротуарное покрытие.

Рекламораспространитель (победитель аукциона) самостоятельно получает технические условия и изготавливает проект на электроснабжение рекламной конструкции, с учетом требований ТКП 45-4.04-287-2013 (если это требуется). При производстве строительно-монтажных работ руководствоваться Правилами по охране труда при выполнении строительных работ (Постановление № 24/33 от 31.05.2019 г. Министерства труда и социальной защиты Республики Беларусь и Министерства архитектуры и строительства Республики Беларусь).



## Извещение об открытом аукционе по продаже не завершенного строительством жилого дома и земельного участка в частную собственность в г. Гродно 16 мая 2023 года

| № лота | Местонахождение земельного участка, его кадастровый номер | Площадь земельного участка (га) | Характеристика (описание) не завершенного строительством капитального строения | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Гродненская область, г. Гродно, ул. Гожская, У-6А, 440100000002006061 | 0,1498 | Незавершенное незаконсервированное капитальное строение, степень готовности 11 %. Фундамент железобетон; наружная площадь 153 кв. м | 7 700 |
| Ориентировочные расходы по подготовке документации для проведения аукциона: 367,44 руб. Начальная цена предмета аукциона 38 718,17 руб. (в том числе: начальная цена не завершенного строительством капитального строения 8 548,45 руб.; земельного участка: 30 169,72 руб.) | | | | |
| 2 | Гродненская область, г. Гродно, ул. Кондрата Крапивы, 31 (У-455, микрорайон «Заболоть»), 440100000002007107 | 0,0966 | Незавершенное незаконсервированное капитальное строение, степень готовности 8 %. Фундамент: железобетон; наружная площадь (площадь застройки): 78 (78) кв. м. Уборная: материал – кирпичи, площадь застройки – 3 кв. м, размеры 1,51 х 1,77 м, кровля – деревянные изделия, фундамент – кирпичи | 6 200 |
| Ориентировочные расходы по подготовке документации для проведения аукциона: 365,65 руб. Начальная цена предмета аукциона 31 232,67 руб. (в том числе: начальная цена не завершенного строительством капитального строения 4 088,07 руб.; земельного участка: 27 144,60 руб.) | | | | |

Земельный участок предоставляется в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Инженерные коммуникации на участке отсутствуют. Возможность подключения к внеплощадочным сетям водоснабжения, газоснабжения, электроснабжения и пр. и точки подключения определяются проектом. Земельный участок может иметь ограничения и обременения. Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона: внесение платы за предмет аукциона и возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и представлением участникам документации, необходимой для его проведения в течение 10 рабочих дней; обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «ГАГРЗК» в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся; в установленный срок продолжить строительство жилого дома. Затраты на организацию и проведение аукциона рассчитываются исходя из фактических затрат и доводятся до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись.

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости».

Для участия в аукционе необходимо: внести задаток в указанном размере, перечисляемый на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 Гродненское областное управление № 400 ОАО АСБ «Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY2X, УНП 590727594, код назначения платежа 40901, получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению; представить в коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» следующие документы: заявление на участие в аукционе установленной формы; документ, подтверждающий внесение суммы задатка; подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы; дополнительно представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; представителем или уполномоченным должностным лицом негосударственного юридического лица РБ – доверенность, выданная юрлицом, документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица. При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

**Аукцион состоится 16 мая 2023 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1 (актовый зал).**

**Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 117 с 17 апреля по 11 мая 2023 года включительно в рабочие дни с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.**

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи, не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220. Аукцион проводится аукционистом при наличии двух или более участников аукциона. Аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер не поднимет только один участник аукциона. Аукционист называет аукционный номер этого участника, трижды последнюю цену и объявляет о продаже предмета аукциона, а участника аукциона – победителем аукциона в отношении соответствующего предмета аукциона. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником либо для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов. Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

**Контактные телефоны: + 375 (152) 626055, 626056. http://gcn.by, telegram-канал: https://t.me/grodno_cn**

# ШЛЯХ АДКРЫТЫ ДЛЯ ЎСІХ

***Узлюбленыя ў Хрысце архіпастыры, пастыры, манахі і ўсе верныя сыны і дочкі Беларускай Праваслаўнай Царквы!***

ХРЫСТОС УВАСКРОС!

Прайшлі дні Вялікага посту, прайшоў тыдзень Пакут Гасподніх з яго журботнымі і выратавальнымі перажываннямі, і храмы нашы зноў напоўнены веруючымі. Але сёння мы ўжо не смуткуем, не плачам і не тужым. Цяпер мы «смерці святкуем умярцвенне, пекла разбурэнне, пачатак іншага — вечнага жыцця» (пасхальны канон, твор Іаана Дамаскіна. Песня 7).

Невымоўнай радасцю напоўнены нашы сэрцы, і гэтая радасць не зямная, а нябесная, яна вышэйшая за ўсякае іншае чалавечае перажыванне. Водгукі гэтага духоўнага лікавання, перажытага апосталамі і жанчынамі-міраносіцамі, мы чуем у кожным слове песнаспеваў пасхальнай службы.

Мы ведаем прычыну і аснову гэтай урачыстасці: «Хрыстос уваскрос з мёртвых, першынец з памерлых» (1 Кар. 15, 20). Таму ні смерць, ні грэх, ні пекла не пануюць больш над намі. І разам з пракрокам Асіем і апосталам Паўлам мы смела ўсклікаем: «Смерць! дзе тваё джала? пекла! дзе твая перамога?» (1 Кар. 15, 55).

«Хрыстос уваскрос з мёртвых, смерцю смерць растаптаў, і тым, што ў магілах, жыццё дараваў», — гэтыя ўрачыстыя словы пасхальнага трапара, азараючы нашы сэрцы, заклікаюць зноў і зноў пранікаць у іх глыбокі сэнс.

«Як праз аднаго чалавека грэх увайшоў у свет, а праз грэх — смерць, так і смерць перайшла на ўсіх людзей» (Рым. 5, 12). Грэх разрывае не толькі сувязь чалавека з Богам, ён разбурае таксама і адносіны паміж людзьмі, таму і смерць мае не толькі індывідуальнае, але і сацыяльнае вымярэнне. Менавіта грэх з'яўляецца прычынай разладаў унутры сям'і, грамадства і нават паміж народамі.

Гасподзь наш Іісус Хрыстос Сваёю смерцю і ўваскрэсеннем ацаляе ўсяго чалавека, ва ўсёй паўнаце яго ўласцівасцяў і адносін. Сын Божы «ўпакорыў Сябе і быў паслухмяны нават да смерці, і смерці крыжовай» (Флп. 2, 8). Пакорнасцю і паслухмянасцю Свайму Нябеснаму Айцу, бязмернай любоўю да чалавечага роду Ён аднавіў страчаную чалавекам сувязь з Богам і разам з тым паказаў нам шлях да адзінства і міру, да аднаўлення гармоніі чалавечых адносін.



Таму пойдзем услед «ад смерці да жыцця...», ад граху і няпраўды да спраў любові і міласэрнасці, бо вера ў Хрыста Уваскрэслага, выкананне Яго запаведзяў, любоў да Бога і бліжніх з'яўляюцца самым трывалым залогам міру, згоды і адзінства. Паводле слова святыцеля Грыгорыя Багаслова, «нямногія кроплі крыві (Спасіцеля) аднаўляюць цэлы свет і для ўсіх людзей робяцца тым самым, чым бывае закваска для малака, збіраючы і звязваючы нас у адно цэлае».

«Любоў, радасць, мір, доўгацярплівасць, добрасць, міласэрнасць, вера, лагоднасць, устрыманасць...» (Гал. 5, 22-23) — вось плён духоўнага і праведнага жыцця, вось шлях вырашэння ўсіх супярэчнасцяў, шлях, які з'яўляецца стваральным. Пасля Уваскрэсення Хрыстовага гэты шлях адкрыты для ўсіх. І кожны з нас у цяперашнія няпростыя часы можа памножыць меру дабра і любові на тым месцы, дзе яго паклікаў Гасподзь.

Сёння выразна адчуваецца нарастанне напружання ва ўсіх сферах чалавечага жыцця. Але Уваскрэсенне Хрыстова — гэта маяк у бурным моры, які заўсёды паказвае нам на той трывалы падмурак нашай веры і нашай радасці, якую ніхто і нішто не зможа ў нас адабраць. Бо, паводле слоў святыцеля Філарэта Маскоўскага: «Надзея наша (на спасіцельны подзвіг Хрыста) заснавана глыбей за цяперашні свет і вышэй за яго ўзведзена».

У гэтыя святыя дні жадаю, каб мір Божы, які Хрыстос абвясціў Сваім вучням, панаваў у кожнай душы і кожнай сям'і, каб Гасподзь захаваў мір у нашай краіне і дапамог людзям добрай волі аднавіць яго на землях брацкай Украіны. Няхай святло пасхальнай радасці асвятляе сэрца кожнага чалавека, а слова пра Крыж і Уваскрэсенне няхай заўсёды жыватворча і дзейсна пранізвае ўсе нашы думкі і кожны наш учынак. Будзем памятаць пра тое, што мір — гэта дар Божы, і прыкладзём усе намаганні, каб зберагчы гэты вялікі дар.

**Веніямін,**
**Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі,**
**Патрыяршы Экзарх**
**усяе Беларусі**
**Пасха Хрыстова, 2023.**
*горад Мінск.*

# Вялікая будаўнічая пляцоўка

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

— Сродкі будуць патрачаны найперш на інфраструктуру: вуліцы і тратуары, інжынерныя камунікацыі — усё, што зробіць горад больш сучасным, прыгожым, зручным, — расказаў карэспандэнту газеты **начальнік аддзела архітэктуры, будаўніцтва і жыллёва-камунальнай гаспадаркі райвыканкама Валерый РУСАКЕВІЧ.** — Плануецца капітальна адрамантаваць амаль 10 кіламетраў вуліц. Там з'явіцца новае асвятленне і тратуары. На трох асноўных транспартных артэрыях горада будзе пракладзена ліўневая каналізацыя. На двух кіламетрах дарожнікі ўзяліся выканаць бягучы рамонт. Акрамя гэтага, будзе адрамантавана сем кіламетраў рэспубліканскіх аўтамабільных дарог і тры кіламетры мясцовых.

Зараз практычна скончана пракладка асфальту па вуліцы Суворава. Вуліца злучае паўночна-ўсходні раён горада з чыгуначным вакзалам. Названы раён мае некалькі кварталаў індывідуальнай жылой забудовы, вуліца асабліва важная для транспартных камунікацый навасёлаў. Таксама дарожнікі працуюць на вуліцах Арлоўскага і Кастрычніцкай. На першай з названых ужо пакладзены асфальт, на другой работа вядзецца, падыходзіць да завяршэння пракладка тратуараў. Абнаўляюцца вуліцы Заслонава і Чайкоўскага.

На скрыжаванні вуліц Арлоўскага і Праскурава радуе вока новы асфальт, роўнымі радамі кладзецца тратуарная плітка. Цікава, што вуліца, названая ў гонар былога рэдактара раённай газеты Васіля Праскурава, была прыведзена ў парадак раней за кошт раённага бюджэту, цяпер толькі абнаўляюцца тратуары. А вось суседнюю Арлоўскага абнаўляюць зараз, у рамках падрыхтоўкі да дажынак. Работу выконваюць спецыялісты мясцовага ДРБУ-100.

### Капітальны і бягучы рамонт

Адначасова вядзецца капітальны рамонт шэрагу жылых дамоў. Пяціпавярховік па Кастрычніцкай, узведзены недзе на пачатку 1980-х, неўзабаве атрымае новае аблічча, тут ва ўсю працуюць спецыялісты ЖКГ. А ўсяго за гэты час капітальна адрамантуюць сем жылых дамоў, іншыя шэсць перажывуць бягучы рамонт. Капітальны рамонт з мадэрнізацыяй чакае дзіцячы садок № 4. Будзе праведзена ўцяпленне сцен, замена інжынерных камунікацый. Каб маленькім выхаванцам было цёпла і ўтульна ў іх дзіцячай установе, з бюджэту выдзяляецца каля 800 тысяч рублёў.

Добраўпарадкаванне ахопіць і прывакзальную плошчу чыгуначнай станцыі Ганцавічы. Замест асфальтавага палатна з'явіцца больш стыльная тратуарная плітка. Сам будынак станцыі таксама папрыгажэе, яго фасад будзе адрамантаваны, а колькасць паркавачных месцаў для тых, хто сустракае і праводзіць пасажыраў, павялічыцца. Абновіцца і аўтавакзал, а таксама Дом культуры, кінатэатр. Каля мільёна рублёў пойдзе на аздабленне ліцэя сельскагаспадарчай вытворчасці і прывядзенне ў парадак тэрыторыі вакол установы. Двор школы № 1 зусім хутка чакае добраўпарадкаванне. На тэрыторыі Дома дзіцячай і юнацкай творчасці з'явіцца новы спартыўны аб'ект — скейт-парк. Фінансаванне парку вядзецца па абласной інвестпраграме. Юныя ганцаўчане атрымаюць зону актыўнага і бяспечнага адпачынку.

### Медыцынская сфера ў прыярытэце

У сацыяльнай сферы асаблівы ўпор робіцца на медыцыну. Дарэчы, работы ў Цэнтральнай раённай бальніцы вядуцца пачынаючы з мінулага года. Асвоена ўжо 160 тысяч рублёў, у гэтым годзе плануецца асвоіць 2,8 мільёна. Цяпер рамантуецца паліклініка. Пабудаваная ў канцы 1980-х гадоў, яна ўжо зачакалася мадэрнізацыі. Рэканструкцыя вядзецца паэтапна, каб не перашкаджаць працэсу лячэння людзей. Тут працуюць майстры прадпрыемства «Палессежылбуд». У іх вялікі вопыт работы на падобных аб'ектах, таму ёсць усе падставы спадзявацца на высокую якасць праведзенай рэканструкцыі.

Аддзяленні і службы паліклінікі на гэты час стараюцца пацясніцца, каб вызваліць частку аднаго з паверхаў. Туды прыходзяць будаўнікі, мяняюць інжынерныя камунікацыі — сантэхніку, электрыку, затым прыступаюць да аздаблення. Завозяцца мэбля, абсталяванне, потым ранейшае аддзяленне заязджае на былыя плошчы. Два крылы аднаго паверха спачатку здзіўляюць кантрастам, а потым прыходзяць да агульнага выгляду з якасным і сучасным аздабленнем. І медыкі, і пацыенты разумеюць, што трэба пацярпець часовыя нязручнасці, каб з часам наведваць лячэбную ўстанову стала цалкам камфортна.

Не застаюцца ўбаку ад падрыхтоўкі да восеньскага святкавання прадпрыемствы і арганізацыі раёна. Напрыклад, раённае спажывецкае таварыства ўзялося капітальна адрамантаваць чатыры свае крамы, правесці бягучы рамонт на 16 аб'ектах гандлю і грамадскага харчавання. Прадпрымальнікі, бізнесмены таксама палепшаць і адновяць каля трох дзясяткаў сваіх аб'ектаў.

— Я не магу, зыходзячы са сваіх сімпатый, расставіць мастакоў па рангу. Іх шмат, я любуюся і захапляюся іх талентам, вучуся ў іх. І спіс гэтых імёнаў такі вялікі, што не хопіць чарнілаў, каб усіх пералічыць. А з Брэйгелем мяне параўналі першы раз у Францыі. У мяне там з галерэяй эксклюзіўны кантракт ужо, уяўляеце, 27 гадоў... Назвалі артыкул «Беларускі Брэйгель». І гэта падхапілі. Якія кропкі судакранання з Брэйгелем? «Сапраўдны» мастак пярэдні план малюе выразна, а тое, што далей, — сфумата, дымка... А я нібыта аб гэтым нічога не ведаю, і задні план малюю гэтак жа выразна, і на паветраную, і лінейную перспектывы нібыта забыўся... І ў Брэйгеля гэтак жа.

***— А з прозай Венечкі Ерафеева не адчуваеце падабенства? Захопленасць жыццём, а за гэтым іронія, настальгія...***

— Так, але ў Ерафеева «Масква-Петушкі» бліжэйшая да сатыры. А сатыра і гламур — не маё. Я не малюю карыкатуры. І гісторыі ў мяне не гламурныя... Павінна быць проста душэўна... Як музыка фартэпіяна...

***— Вы, дарэчы, заўсёды ставіце сабе ў майстэрні для фону класічную музыку, як цяпер?***

— Не заўсёды. Так, класіку люблю, Шапэна. Але ж вельмі люблю і джаз. За сучаснай музыкай сачу, але яна стала нейкая папсовая...

***— Аляхновічы, што пад Мінскам, вы называеце «мае Аляхновічы». Чым дарагая для вас гэтая мясціна, чым адметная?***

— Я вельмі шчаслівы, што ў маім жыцці ёсць Аляхновічы. Гэта як падарунак Бога. Мне, асабліва гарадскому хлапчуку, раптам апынуцца ў гэтым хутарскім свеціку, з курамі, кацянятамі, з каровамі і парсючкамі, пчоламі і мёдам, са сланечнікамі, з парэчкай і агрэстам, яблыкамі, бульбай, сенам, з хатнім тварагом і кумпякамі, з ходзікамі, што цікаюць на шпалерах у кветкі, з квадратным тэлевізарам «Гарызонт» і праграмай «Час». З каханай, маладой жонкай і клапатлівай цешчай, з выдатнымі застоллямі на Вялікдзень, з душэўнымі песнямі румяных Шуплячых, Зяневічых, Сашак і Віцек... Гэта было сапраўднае жыццё, асалода для сэрца, душы, якая апладняла мяне як мастака сваімі жыватворнымі сокамі.

***— А як вы трапілі ў Аляхновічы?***

— Гэта называецца «пайшоў у прымы». Пазнаёміўся з дзяўчынай, калі вучыўся ў Маскве ў паліграфінстытуце, яна там вучылася на завочным. Вяселле наша таксама было ў Аляхновічах. Мне вельмі спадабалася — не дарожкай чырвонай, а па ўзгорках ідзём, па траве, нявеста ў белым вэлюме... Я ўсіх людзей там любіў. Мне здавалася, гэтыя людзі — проста анёлы, бабулькі, дзядулькі...

***— На вашых малюнках Аляхновічы ёсць?***

— Я ствараю нейкі абагулены вобраз. Адзінае, для мяне ідэальны горад — гэта калі дрэвы вышэйшыя за дамы, калі побач кветкі, кошкі, сабакі...

***— Калі вы малюеце карціну, гэта для вас цэлая гісторыя з распрацаваным сюжэтам, накшталт літаратурнага апавядання, ці нешта на ўзроўні вобразаў снабачання? Вы спрабавалі калі-небудзь запісваць свае карціны словамі?***

— Сюжэт карціны з'яўляецца зусім выпадкова. Для гэтага не трэба напружвацца, спрабуючы аднавіць у памяці нейкую жыццёвую калізію або перадсвітальныя мроі. Гэта як у Ахматавай — невядома з якога смецця. Але сюжэт пасяляецца ў табе і пачынае развівацца. Я яго складаю ў сабе. Але вось у самым пачатку 1990-х гадоў пачаў пісаць дзённік і працягваю да гэтага часу.

***— Памятаю, на вашай выстаўцы стаяць людзі перад карцінай «Адкрываючы новыя сусветы», на якой у небе ў выглядзе касмічнага карабля — адкрывалка для кансерваў, і гадаюць, што гэта сімвалізуе...***

— Ну, з майго боку тут чысты сцёб. Я сам чалавек іранічны, вясёлы, хоць нехта з боку можа вырашыць, што я пануры. Памятаю, сустракаў жонку Ларысу з Японіі ў аэрапорце, яна спускаецца, а мне яе супрацоўніца кажа: «Ну, гэта ж твая жонка прыляцела, давай, усміхайся!» А я такі стаю, як мытнік... Мне спадабаўся вобраз: адкрывалка — гэта ж не толькі бляшанку можна адкрываць, але і сусвет! Часам словаспалучэнне нейкае парадаксальнае мяне захапляе. Некалькі разоў карціны нараджаліся менавіта ад такіх словаспалучэнняў. Напрыклад, мне не вядома, з чаго прыйшло ў галаву: «Жар-птушка, тушаная з грыбамі». Пафасная птушка, але ўсё адно — дзічына! І я напісаў такую карціну.

***— У вашых творах я заўважаю часта матыў эскапізму: маленькі свет людзей, хатняя ўтульнасць абаронены нейкім бар'ерам — свет у чоўне, пад шкляным каўпаком, у палатцы, дзе адбываецца маленькае шчасце маленькіх людзей...***

— Сапраўды так... Вось я вам пакажу зараз сваю работу, дзе я таксама змясціў цэлае жыццё ў абмежаванай прасторы: у вазоне з геранню! Герань — гэта ж сімвал хатняй цеплыні. Гэта ў ружах можа быць Палац шлюбаў... А ў герані — хатняе жыццё!

***— Ці ёсць мяжа паміж інсітным мастацтвам, кічам і прафесійным мастацтвам і дзе яна?***

— Ужо даўно ў мастацтве няма ніякіх меж. І я кажу ў агульным кантэксце, а не толькі пра выяўленчае мастацтва. На жаль, гэта закранула і штодзённае жыццё. Так, сціраюцца грані ў модзе, з'явіўся стыль унісекс, а ў некаторых краінах нават прыбіральні сталі агульныя. Што да выяўленчага мастацтва, то ўжо ніхто не супрацьпастаўляе кітч і прафесійнае мастацтва. І першае, і другое — прафесійнае. Таму што кітч стаў адной з плыняў сучаснага мастацтва, а таленавітыя і разумныя мастакі, памайстэрску жангліруючы характэрнымі асаблівасцямі гэтай масавай безгустоўнасці, сталі ствараць арыгінальныя і высокапрафесійныя творы ў гэтым стылі. Тым больш што гэта ўжо не так актуальна, таму што на аснове гэтага нарадзіўся новы стыль кэмп, які спецыяльна стварае эстэтыку вульгарнага, пахабнага, вычварна пачуццёвага. І гэта таксама прафесійнае мастацтва.

***— Ці праўда, што па вашых карцінах быў пастаўлены спектакль?***

— Я рады, што мая творчасць мае другое жыццё. Яна працягваецца ў афармленні кніг, музычных дыскаў і нават на тэатральных падмостках. Так дзяржаўны тэатр у Казані паставіў на сваёй сцэне спектакль «Зімовая казка для дарослых» на аснове маіх карцін. Быў прыдуманы аб'яднальны сюжэт, напісаны тэкст і пашыта адзенне, у якім жывуць мае героі на карцінах. Мяне запрасілі на прэм'еру, і было вельмі цікава бачыць, як мае крыху недарэчныя і добрыя персанажы ажылі і загаварылі. Напрыклад, ёсць у мяне карціна: немаладая пара сядзіць і глядзіць тэлевізар. У спектаклі ў іх вусны ўклалі такі тэкст: «— Як ты думаеш, Зяма, мы едзем у Ізраіль ці не едзем?» — «Усе едуць, і нам трэба ехаць».

***— Ці ёсць такая ваша карціна, у якой вы хацелі б пасяліцца?***

— У большасці маіх работ жыццёвая прастора суцэльна гарманічная для чалавечага пасялення. Там няма абуральнай раскошы, нейкага багацця або райскіх шатаў. Але мне мілая такая шчырая простасць. На маіх палотнах асяроддзе і чалавек — адно і тое ж.

***— Адны творцы імкнуцца ў прарокі, другія абіраюць долю блазнаў і менестрэляў... Трэція проста працуюць як рамеснікі. Якім, па-вашаму, павінна быць месца мастака ў сучасным свеце?***

— Час усё расставіць па сваіх месцах. Ён не будзе ўлічваць тыя граматы і рэгаліі, якія творца набыў пры жыцці. Таму трэба проста сціпла рабіць тое, што ў цябе добра атрымліваецца, і дзякаваць Боженьку за магчымасць жыць і ствараць!

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

# «ТУТ ВУЧЫЎСЯ ЛЁТЧЫК-КАСМАНАЎТ»

**На школе, дзе вучыўся Алег НАВІЦКІ, з'явіцца памятная дошка.**

12 красавіка ўвесь свет штогод адзначае Дзень касманаўтыкі — у памяць першага палёту чалавека ў космас. У Беларусі гэтае свята абавязкова адзначаецца і ў майстэрні «зорнага скульптара» — **народнага мастака Беларусі Івана Якімавіча МІСКО**, які шмат стварыў на касмічную тэму. У майстэрні-музеі, дзе часта бывалі госці з арбіты, цэлыя шэрагі скульптурных партрэтаў касманаўтаў, на люстэрку і на дзвярах — іх аўтографы, на пастаментах — праекты помнікаў на тэму космасу.



Цяпер Іван Якімавіч завяршае працу над чарговым праектам — мемарыяльнай дошкай, якая будзе змешчана на школе ў Чэрвені, дзе вучыўся наш славуты зямляк, касманаўт Алег Навіцкі. На макеце ёсць ужо ўсе элементы: профіль героя, стылізаваныя арбіты і зоры, на якія скіраваны позірк касманаўта, надпіс: «У нашай школе вучыўся Алег Віктаравіч Навіцкі, лётчык-касманаўт, герой Расійскай Федэрацыі, ганаровы грамадзянін Мінскай вобласці і Чэрвеньскага раёна, які здзейсніў тры касмічныя палёты».

Скульптар распавядае, што Алег Навіцкі, калі быў у майстэрні, запытаўся: «Чаму ў надпісе значыцца «тры палёты», раптам іх будзе больш?» Іван Якімавіч запэўніў, што, як толькі лічба зменіцца, слова «тры» ён зрэжа і заменіць на «чатыры»... Пасля на «пяць»... І далей — колькі там яшчэ атрымаецца.

Алега Навіцкага, з якім яны цесна супрацоўнічаюць, Іван Якімавіч шмат разоў ляпіў з натуры, у майстэрні знаходзіцца нават гіпсавая маска, знятая з касманаўта. Дарэчы, сваю працу над мемарыяльнай дошкай Іван Якімавіч робіць дабрачынна, у падарунак касманаўту-земляку — толькі на бронзу, з якой будзе адлітая дошка, давялося знайсці сродкі.

Цяпер засталося дачакацца, калі Алег Навіцкі зможа прыехаць, каб прысутнічаць на ўрачыстай цырымоніі адкрыцця дошкі на яго роднай школе. Там, дарэчы, дзейнічае і музей знакамітага колішняга вучня.

Іван Міско, які нядаўна адзначыў свой 91-ы дзень нараджэння, працягвае ўвасабляць у творах тэму космасу. У Мастацкай галерэі М. Савіцкага, што непадалёк, дзейнічае выстаўка «Дыялог з космасам», прысвечаная Юрыю Гагарыну, з творамі Івана Якімавіча і экспанатамі з музея-запаведніка Юрыя Гагарына. Дарэчы, на люстэрку ў майстэрні Івана Міско ёсць роспіс маці першага касманаўта, якая была тут больш чым дваццаць разоў. На адкрыццё выстаўкі «Дыялог з космасам» прыязджала пляменніца Гагарына. А Іван Міско зрабіў музеюзапаведніку падарунак — памятны знак з аўтографам Гагарына, выкананы з граніту і бронзы.

У народнага мастака Беларусі ёсць яшчэ шмат задум.

— Хачу зрабіць выстаўку, якая будзе называцца «А што там, за зямной арбітай...» Выставіць сярод іншага партрэты іншапланецян, якімі я іх уяўляю. Не магу дачакацца, калі вылеплю партрэт першай беларускай касманаўткі — прыдумаў ужо кампазіцыю, назаву партрэт «Касмічная беларусачка». Яшчэ хачу, каб у Слуцку ў наступным годзе адкрылі знак ці нават помнік мясцоваму ўраджэнцу, Герою Сацыялістычнай Працы, інжынеру Сямёну Козбергу, які працаваў разам з Сяргеем Каралёвым, прыдумаў новыя віды рухавікоў для касмічных апаратаў. Палёт Юрыя Гагарына таксама адбыўся з яго ўдзелам. Ну, і згадаю яшчэ маю вялікую мару, з якой не расстаюся, — у мінскім парку Перамогі добра было б устанавіць помнік удовам Вялікай Айчыннай вайны як знак захавання гістарычнай памяці народа...

**Людміла ІВАНОВА.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

Прэм'ера

# А можа, дзверы лепш не адчыняць?..

## Раптам там дзіўная старая, якую прыдумаў пісьменнік Хармс?

**Чаканне не заўсёды супадае з тым, што адбываецца ў рэчаіснасці. Гэта справядліва ў дачыненні да галоўнага героя спектакля «Вось я і прыйшла!», прэм'ера якога адбылася ў Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі. Але гэта справядліва і да гледачоў, якія збіраюцца яе паглядзець. Бо адна справа — літаратурны твор пад назвай «Старая», а зусім іншая — спектакль, які створаны «па матывах». Гэта значыць, усё, што не па Хармсу і нават з адыходам ад яго, — тая самая тэатральная гульня, якая пастаноўшчыкаў робіць аўтарамі сцэнічнага твора. Галоўнае тут — адпавядаць дзівацтву і дарыць здзіўленне, як гэта ўмеў Данііл Хармс на пачатку XX стагоддзя, вядомага сваімі творчымі эксперыментамі, у тым ліку літаратурнымі. А калі мог эксперыментаваць ён, то чаму стваральнікам і артыстам нельга? Тым больш што РТБД вылучаецца адмысловасцю, што, відаць, дапамагае яму трымацца на пазіцыях лідара па наведвальнасці і акупляльнасці сярод усіх тэатраў Беларусі (паводле вынікаў за мінулы год, агучаных Міністэрствам культуры).**



Калі хто шукае, каб на сцэне было небанальна і дзіўнавата, то Хармс — самы той аўтар. У 20-я гады XX стагоддзя ён стаў адным з актыўных літаратараў-наватараў, і для нашага часу тыя эксперыменты ўяўляюць цікавасць, і не столькі з пункту гледжання нейкай адметнай эстэтыкі, колькі з-за асаблівага ўспрымання рэчаіснасці — нездарма ён меў дачыненне да заснавання «Аб'яднання рэальнага мастацтва». А рэчаіснасць кожны бачыць па-свойму. У тым ліку па-свойму ўвасабляе яе ў тэатры.

Пісьменнік — тут вывелі вобраз самога Хармса (артыст Максім Брагінец), уключыўшы ў тэкст спектакля нават яго дзённікавыя запісы — б'ецца ў творчых пакутах. А гэта сітуацыя сама па сабе стварае глебу для гульні ўяўлення. Да яго прыходзіць старая і памірае. Што рабіць? Сітуацыя жудасная і абсурдная — як у самога Хармса. Ну так, але гэты абсурд адкрывае такія магчымасці для інтэрпрэтацыі. Тут герой жыве ў хляве, хоць у пісьменніка быў пакой у кватэры. У Хармса была толькі адна старая. Малады рэжысёр Аляксандр Бародка палічыў, што для тэатральнага абсурду малавата — у спектаклі старых значна больш. Яны з'яўляюцца адна за адной і кпяць з пісьменніка ў творчым крызісе. Нават Сакердон Міхайлавіч (Сяргей Шымко), які вось толькі што быў не супраць выпіць гарэлкі з таленавітым аўтарам, па-здрадніцку пераходзіць на іншы бок рэальнасці. Ды і тая паненка, што можа стаць вытанчанай музай, у пэўны момант раскрывае сваю іншасць. А можа, усе гэтыя дзіўныя істоты, што пераследуюць творцу і ўводзяць яго ў шок, і ёсць яго музы? Хто ведае, як яны насамрэч выглядаюць?..

Фантасмагорыя, трызненне чалавека са змененай свядомасцю альбо абсурдны сон, за якім назірае глядач, пераносіцца лёгка: нездарма жанр пазначаны як «камедыя парадоксаў». Зразумела, гледачы РТБД да ўсяго гатовыя — і да камедый, і да парадоксаў, у якія, дарэчы, адразу ўводзіць выгляд жанчын, якія наведваюць героя. Яны хоць і розныя, але нечым падобныя (пра што паклапацілася мастак па касцюмах Марына Алекна). Ужо са з'яўлення другой няма пытанняў наконт прыроды гэтых істот. Застаецца толькі сачыць за стасункамі герояў, лавіць іх словы, якія гучаць на цудоўнай беларускай мове (дзякуючы Марыі Пушкінай). А таксама ўслухоўвацца ў песні, створаныя паводле вершаў Данііла Хармса (аўтар музыкі Аляксандр Гембіцкі). Але гэта не матэрыялізацыя Хармса (хоць партрэт на сцэне будзе да гэтага схіляць), бо ў пісьменніка абсурд і парадаксальнасць — частка прыроды самой рэчаіснасці, у яго ўсе сітуацыі вельмі чалавечыя і рэалістычныя, нават старая, хіба што яе гадзіннік без стрэлак намякае на дзіва (але старыя ж бываюць дзіўнаватыя ў жыцці). Глядач спектакля адразу адчувае адыход ад рэчаіснасці — тут яна падкрэслена тэатральная, гучная і пазначана пэўнай колеравай гамай (мастак Юрый Саламонаў). Таму напружвацца і ламаць галаву: хто тут і чаму — не асабліва трэба, хіба што пасміхацца час ад часу, рэагуючы на сітуацыі і словы, Ну, і няхай. Бо камедыі бываюць розныя, а гэта з вэлюмам эстэцтва. І са згадкай пра тое, што бываюць розныя формы тэатра, як ёсць розныя варыянты ўспрымання рэчаіснасці. Пісьменнік (герой спектакля) яе не толькі аб'ектыўна выяўляе, але часам і суб'ектыўна канструе. Зрэшты, гэта так ці інакш робяць усе, што і тлумачыць прыязную рэакцыю публікі.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**


**Лот № 1.** Земельный участок с кадастровым номером 620480408601000073 площадью 0,2500 га (право собственности), расположенный по адресу: Минская обл., Березинский р-н, Березинский с/с, д. Тростянка, ул. Советская, д. 9. **Начальная цена продажи – 3 550,00 бел. рублей, задаток – 355,00 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 2.** Земельный участок с кадастровым номером 724884000002000056 площадью 0,0997 га, расположенный по адресу: Могилевская обл., Осиповичский р-н, Протасевичский с/с, СТ «Верейцы». **Начальная цена продажи – 1 176,46 бел. рубля, задаток – 117,65 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 3.** Капитальное строение (здание) с инвентарным номером 441/С-40, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 422950100000000115 площадью 0,0699 га, по адресу: Гродненская обл., Ивьевский р-н, М-6, 92-й км, 4, АЗС. Назначение – здание специализированное для ремонта и (или) технического обслуживания автомобилей (в т. ч. автомобильные заправочные, зарядные и газонаполнительные станции); наименование – здание АЗС с подземными резервуарами и инженерными коммуникациями; площадью 20,7 кв. м. **Начальная цена продажи – 24 688,80 бел. рубля, задаток – 2 468,88 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 4.** Земельный участок с кадастровым номером 624487600006000010 площадью 0,0397 га (право собственности), расположенный по адресу: Минская обл., Пуховичский р-н, Блужский с/с, СТ «Спадчина-88». **Начальная цена продажи – 468,46 бел. рубля, задаток – 46,85 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 5.** Земельный участок с кадастровым номером 424385700001000060 с учетом имущественных прав на него, расположенный по адресу: Гродненская обл., Новогрудский р-н, Волковичский с/с, СТ «Берёзка», д. 11, площадью 0,1134 га. **Начальная цена продажи – 1 270,08 бел. рубля, задаток – 127,01 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

## Сервисно-торговое республиканское унитарное предприятие
# «ТОРГОВЫЙ ДОМ «ВОСТОЧНЫЙ»

извещает о проведении 18.05.2023 открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства

**Лот № 6.** Капитальное строение с инвентарным номером 630/С-39635 общей площадью 123,9 кв. м, год постройки – 1983, расположенное по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Тамары Дудко, 4А/1. Назначение: здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в том числе автомобильные заправочные и газонаполнительные станции); наименование: пристройка АБК цеха малой механизации. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 623850100003002652 площадью 0,8646 га. **Начальная цена продажи – 33 264,00 бел. рублей, задаток – 3 326,40 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 7.** Капитальное строение с инвентарным номером 601/С-13416, назначение: здание специализированное организаций оптовой торговли, материально-технического снабжения и сбыта продукции; наименование: материально-технический склад, общей площадью 1 293,6 кв. м, год постройки 1976, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 623250100001001417. Адрес расположения: Минская обл., г. Логойск, ул. Победы, д. 90. Составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное материально-технический склад с подвалом (А/к), двумя холодными пристройками 1,2, рампой 3. **Начальная цена продажи – 219 456,00 бел. рублей, задаток – 21 945,60 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 8.** Изолированное помещение с инвентарным номером 610/D-42525 общей площадью 39,9 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Демина, д. 39, рынок строительных материалов, торговый ряд № 16, торговый павильон № 212. Назначение: торговое помещение; наименование: торговый павильон. **Начальная цена продажи – 4 320,00 бел. рублей, задаток – 432,00 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 9.** Капитальное строение общей площадью 279,9 кв. м с инвентарным номером 341/С-7058, наименование – магазин № 4, составные части и принадлежности: пристройка (Б1/бл), сарай (1), сарай (2), площадка (а), назначение: здание специализированное розничной торговли, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 324055100001000133, общая площадь земельного участка 0,1722 га (право постоянного пользования) по адресу: Гомельская обл., Октябрьский р-н, г. п. Октябрьский, ул. Янки Купалы, д. 15. Правообладатель: КТУП «Ваш Продмаркет». **Начальная цена продажи – 209 952,00 бел. рубля, задаток – 20 995,20 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 10.** Капитальное строение, инвентарный номер 700/С-48324, назначение – здание специализированное для общественного питания, наименование – здание столовой, расположено по адресу: г. Могилев, ул. Кутепова, д. 28А. Двухэтажное каменное здание столовой, год постройки (дата приемки в эксплуатацию) 1980, общая площадь здания – 869,4 кв. м. Право хозяйственного ведения: РТУП «Белорусское речное пароходство» Расположено на земельном участке с кадастровым номером № 740100000005005425, площадь 0,2158 га, целевое назначение – земельный участок для обслуживания здания столовой. **Начальная цена продажи – 216 900,00 бел. рублей, задаток – 21 690,00 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 11.** Земельный участок с кадастровым номером 624485200002000155 площадью 0,0396 га (право собственности), расположенный по адресу: Минская обл., Пуховичский р-н, Пуховичский с/с, СТ «Веленский Ветеран». Целевое назначение: садоводство в садоводческом товариществе «Ветеран». **Начальная цена продажи – 716,76 бел. рубля, задаток – 71,68 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 12.** Изолированное помещение с инвентарным номером 440/D-1688 площадью 30,4 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Ошмянский р-н, г. Ошмяны, ул. Советская, 30-42. Наименование – однокомнатная квартира; назначение – квартира, число комнат – 1. **Начальная цена продажи – 26 928,00 бел. рубля, задаток – 2 692,80 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

1. Победитель аукциона либо в случае, если заявление на участие в аукционе подано только одним участником, и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) процентов (далее – Претендент на покупку), не позднее 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона на основании счета-фактуры возмещает затраты на организацию и проведение аукциона и оплачивает стоимость приобретенного объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

2. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для победителя аукциона. **Организация и проведение аукциона осуществляются в соответствии с действующим законодательством** Республики Беларусь.

**3. Порядок проведения аукциона, в том числе об оформлении участия в аукционе, указан на сайте konfiskat.by в разделе «Недвижимость».**

**Аукцион состоится 18.05.2023 в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Уручская, 27, актовый зал.**

**Заявление на участие с приложением необходимых документов, в том числе документа, подтверждающего внесение суммы задатка (задатков) с отметкой банка, принимаются по адресу: г. Минск, ул. Уручская, 27 в рабочие дни: пн.–чт. – с 09.00 до 13.00, с 14.00 до 17.00, пт. – с 09.00 до 13.00, с 14.00 до 15.00.**

**Окончание приема заявлений – 15.05.2023 в 15.00.**

Задаток перечисляется на **расчетный банковский счет Организатора аукциона:** р/с BY53 AKBB 3012 0134 7111 1530 0000, БИК AKBBBY2X, ОАО «АСБ Беларусбанк» ЦБУ № 514, г. Минск, ул. Сурганова, 47а, **получатель – Сервисно-торговое республиканское унитарное предприятие «ТОРГОВЫЙ ДОМ «ВОСТОЧНЫЙ», УНП 101127633, ОКПО 37411910. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже капитального строения (изолированного помещения), Лот № ____, проводимом 18 мая 2023 года.**

**Лот может быть снят с аукциона Организатором по письменному указанию Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь в любое время до объявления его проданным.**

**Контакты организатора аукциона: +375 44 763 62 63; + 375 17 266 63 02.**

Уважаемые акционеры
## ОАО «МИНСКИЙ ДОМОСТРОИТЕЛЬНЫЙ КОМБИНАТ»!

УНП 100258980

**27 апреля 2023 года в 12.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «МИНСКИЙ ДОМОСТРОИТЕЛЬНЫЙ КОМБИНАТ»**
по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 43 (актовый зал).

Повестка дня внеочередного общего собрания акционеров:
1. Об увеличении уставного фонда ОАО «МИНСКИЙ ДОМОСТРОИТЕЛЬНЫЙ КОМБИНАТ».
2. Об условиях проведения закрытой подписки на дополнительные простые (обыкновенные) акции ОАО «МИНСКИЙ ДОМОСТРОИТЕЛЬНЫЙ КОМБИНАТ».
3. О результатах закрытой подписки на дополнительные простые (обыкновенные) акции ОАО «МИНСКИЙ ДОМОСТРОИТЕЛЬНЫЙ КОМБИНАТ».
4. О внесении изменений в Устав ОАО «МИНСКИЙ ДОМОСТРОИТЕЛЬНЫЙ КОМБИНАТ».

Реестр акционеров для участия в собрании акционеров будет сформирован по состоянию на 17 апреля 2023 г.
С материалами по вопросам повестки для собрания лица, имеющие право на участие во внеочередном общем собрании акционеров, могут ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 43 в следующем порядке:
- с 20.04.2023 по 26.04.2023 в рабочие дни с 9.00 до 16.45 с перерывом с 12.00 до 12.30 по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 43, каб. 304А, в день проведения собрания – 27.04.2023 – с 9.00 до 11.00 по месту его проведения.
Регистрация участников собрания будет осуществляться **27 апреля 2023 г. с 11.00 до 11.45** по месту проведения собрания.
Для регистрации при себе иметь акционеру Общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

***Наблюдательный совет ОАО «Минский домостроительный комбинат»***

## ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, BELTORGI.BY
Продавец: **ОАО «Лоевский КБО»** (УНН 400028996) 247095, Гомельская обл., г.п. Лоев, ул. Ленина, 24а, тел./факс: +375 232 31-59-72 / 25-26-63, тел. +375 29 135-78-72.
Публичные торги в электронной форме будут проведены: **29 апреля 2023 г. 09.00–16.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY**.

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|
| 1 | Кресло парикмахера (инв. № 2305), 2006 г. в.; Сушуар BS-007 (инв. № 2318), 2008 г. в. | 135,00 |
| 2 | Гладильный каток (инв. № 2309), 2007 г. в. | 99,00 |
| 3 | Форма метал. кольца КС-10,9 (инв. №№ 2552, 2553, 2554), 2013 г. в. (3 ед., некомплект) | 594,00 |

Местонахождение – г. Гомель, ул. Б. Хмельницкого, 77.
Телефон для ознакомления и осмотра +37529 698-53-53.
**Для участия в торгах необходимо** в срок с 15.04.2023 г. 09.00 по 28.04.2023 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «Сбер Банк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».
Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и оплатить аукционный сбор.
Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 07.03.2023 г.

Простая мова

# Кожнаму сваё,

## альбо Сакрэты стройнай фігуры



**Усякае параўнанне, як вядома, кульгае, але...**
**Жывеш — нібы едзеш на ровары. Калі ў добрым здароўі, настроі, па добрай дарозе і ў добрае надвор'е, то ехаў бы і ехаў, як той казаў: дыхаў на поўныя грудзі, глядзеў па баках, любаваўся... Ды што там — нават пагоркі з радасцю «браў»!**
**Калі ж хоць нешта раптам нядобрае — хочацца спыніцца, збочыць, сысці з дыстанцыі...**
**І ўтрымаць тады можа адно, зусім кароткае слова: «трэба».**

### МЫ Ў АДКАЗЕ...

З дому на работу Іванавіч сыходзіў рана: а палове сёмай. Загадзя ўставаў, збіраўся, ішоў у кухню, дзе яго ўжо чакала талерка з кашай, яешняй або запяканкай, кубак добрай гарбаты...

Не, ён не панскага роду — што-нішто «зварганіць» мог бы і сам, але жонка сказала, што ёй — спакой даражэйшы за гадзіну сну, і таму штодня ўставала, гатавала сняданак, сачыла, ці добра адзеўся — на развітанне з акна махала рукой.

І вось так — амаль сорак гадоў!

Праўда, было, бо цяпер Іванавіч на пенсіі — не працуе. А значыць, шмат што можа дазволіць: ну хоць бы і паспаць — ад душы, да паўдня!

Але ж ён устае — разам з жонкай, «дапамагае» ёй паснедаць (удваіх — смачней), праводзіць на работу (альбо махае рукой — з акна), вечарам сустракае.

Кажа, што спакой яму даражэйшы!

### ШТО ПАСЕЕШ...

Рэакцыя на словы «Мама, я жанюся» бывае, напэўна ж, розная: ад... грознай «Адумайся!.. Рана... Ты што — звар'яцеў?!» да шчаслівай «Няўжо?! Дзякуй богу!.. І калі ж мы справім вяселле?»

Большасць бацькоў рыхтуюць яго, а Міхайлаўна (яна ў сям'і за галоўную) — дык яшчэ і кватэру: маладажонам, сыну з нявесткай, пакідала сваю ў горадзе, з мужам з'язджала ў вёску і разважала пры гэтым так: «А што — яны маладыя... Няхай жывуць, ствараюць сям'ю — думаюць пра дзяцей, а не пра тое, як будавацца».

...За дзеткамі і насамрэч справа не стала: у хуткім часе ў Міхайлаўны з'явілася ўнучка, потым яшчэ адна. Сябруюць з бабуляй. А ўжо сын з нявесткай — і пагатоў!

Перад Вялікаднем, казала, прыехалі, усё чыста парабілі, памылі-прыбралі, гардзіны павесілі. Ёй толькі жыві ды радуйся!

### ШТО ТОЙ КЛІНОК, ШТО ГЭТЫ

Слова porte ў перакладзе з французскай — «насіць».

Не выключана, што ад яго нашы порткі.

Некалі (дзякуй богу, даўно) іх, казалі, не купіць было: жанчыны альбо шылі самі — і мужам, і дзецям, альбо хадзілі да краўчых — грошы плацілі. А да таго яшчэ ж трэба было тканіну дастаць (ці купіць, у чарзе адстаяўшы)...

— Нам з суседкай неяк пашчасціла, — успамінала Ігнатаўна, — паехалі на базар, пастаялі там, прадалі сваё масла, яйкі, смятану і раздзяліліся. Мар'ечка (яна ж краўчыха мая), пакуль наш аўтобус — у бок прадуктовых крамак пабегла, каб гасцінцаў дзецям купіць, я — да прамтаварных...

Толькі разышліся, я ў першую ж краму зайшла, там — людзей да дзвярэй: корт прадаюць. Была такая тканіна, чортавай скурай звалі: шчыльная, ноская... «От каб трохі шырэйшая, — чую ў чарзе, — можна б на мужчынскія порткі пусціць... А на спадніцы — дык самае тое!..»

Займаю чаргу, выбягаю на вуліцу, каб у Мар'і спытаць, колькі тканіны купляць? А яна, бачу, з суседняй крамы выходзіць. Крычу:

— Ма-а-а-р'ечка, тут корт прадаецца! Кажуць, вузкаваты... Дык мужчынам на порткі браць?

— Бяры колькі даюць! — загадвае Мар'я. — А там, калі што, клінок на с... уставім!

Яна потым так і зрабіла. Добрая краўчыха была: усю акругу абшывала! Мяне таксама вучыла: я шмат што падладзіць магу.

...Цяпер гэтай «вучаніцы» 85, першы год у дачкі зімавала, у горадзе. Але ж кожны дзень старалася работу сабе знайсці: каб час хутчэй пралятаў, то есці варыла, то шкарпэткі вязала, то шыла...

Напрадвесні яны з дачкой дзве шафы перабралі: цёплыя рэчы прасушылі — злажылі падалей, што-нішто з лягчэйшых — перамералі, паклалі бліжэй, каб нечым распарадзіцца (людзям аддаць), нешта зараз насіць.

Занятку, карацей, на доўгі вечар было!

Зранку дачка пайшла на работу, пад абед, як заўжды, пазваніла матулі, прычым вясёлая-вясёлая:

— Ты ведаеш, — сказала па сакрэце, — я так пахудзела! Перад Калядамі, помніш, у сінія портачкі ледзьве ўлазіла, а сёння яны мне якраз!

— Ну і дзякуй богу! — азвалася маці. — Значыць, я ўгадала!

— Што ўгадала? — насцярожылася дачка.

— Ды шырыню... Я табе ззаду на паясніцы клінок невялічкі ўставіла.

### САКРЭТ ІДЭАЛЬНАЙ ФІГУРЫ

Кажуць, што акула за пяць вёрст адчувае кроплю крыві, а бабуля — за пяць тысяч (тых самых вёрст), што ўнук галадае.

Ён — бабы Сонін, любімы — даўно не маленькі, восьмы год як жанаты, але ж такі худы! Штораз сустракаючы, бабуля шкадуе яго, ледзь не штораз паўтарае сваё: «А станчэў жа!.. Зніцеў!.. Ці гатуеш ты, Волечка? — пытае ў ягонай жонкі. — Ці корміш чалавека? Выглядае, што, мусіць, не?» — «Ну чаму ж гэта не? — усміхаецца Вольга (і, дарэчы, такая ж «зніцелая»...). — У нашым халадзільніку дзве каструлькі заўсёды стаяць. У большай — суп, у меншай — каша. Калі галодны — садзіся, еш. Калі есці не хочацца — значыць, не галодны».

...Усё лагічна!

(З дыялогаў: «Як перастаць наядацца нанач?» — «Магу расказаць». — «Расказаць і я магу... А як перастаць?»)

### ЯК ЖАНЧЫНА ЖАНЧЫНЕ

Таямніца — жаночы ўзрост! Адны сцвярджаюць, што жанкам не бывае больш, чым 39, іншыя — што больш, чым 19, астатняе — стаж.

Колькі яго ў Леначкі, дакладна не скажаш: мяркуючы па дзецях — шмат, але ж на твары гэта мала адбілася, на фігуры — таксама.

— А сёмай вечара нічога не ясце!? — выдаём замест камплімента.

— Не, — смяецца ў адказ жанчына, — толькі а... дзявятай, бо я ж працую да васьмі. Потым — пакуль дабяруся, пакуль пагрэю... У мяне, дзякуй богу, канстытуцыя.

...Шанцуе: нехта ўсё жыццё са скуры вылузваецца, каб яе змяніць, нехта — проста мае.

### НА ЎСЕ СТО?

Чорны, але ж гумар: «Мне, калі ласка, талон да кардыёлага». — «Запіс — на месяц наперад». — «Як? Што вы гаворыце?! Я ж за месяц памру!?» — «А тады няхай нехта з родных патэлефануе і папярэдзіць, што вы не прыйдзеце».

Гэта быў анекдот. Зараз — чыстая праўда:

Юр'еўна (ёй хутка семдзесят) дачакалася чаргі на тамаграфію, зрабіла, у паліклініцы па месцы жыхарства атрымала даведку. Чытае: «Стан вашых сасудаў адпавядае вашаму ўзросту» і зусім не радуецца, бо там жа пазначаны год нараджэння: 1923 (!).

Значыць, сасуды адпавядаюць гэтаму, стагадоваму (!) узросту? Ці ўсё ж сапраўднаму, таму, што ў пашпарце?..

Як той казаў, ёсць пытанне.

(Трохі іншае — армянскаму радыё: «Чаму ў дактароў так рэдка збываюцца навагоднія пажаданні?» — «Таму што Дзед Мароз не можа разабраць, што ж яны там напісалі).

### КОЖНАМУ СВАЁ

З дому — у краму, потым — на рынак. Гэта блізка, гэта ў крокавай даступнасці», а значыць, не дзіўна, што там знаёмыя гандляры, што гародніну мы купляем у Тані, сухафрукты — у Кузьміча, мяса — у Генадзеўны, хоць часам да яе і чарга...

Нічога — пастаім, а заадно паслухаем такое звычнае тут: «Мужчына, паглядзіце, якое салка!», «...Давайце ўзважу каўбаскі», «Вазьміце грудзінкі! Вось гэты кавалачак... Гляньце!»

Адна з жанчын (пані ў добрых гадах) сапраўды прыпыняецца, прыглядаецца — уголас заўважае, што на суседніх прылаўках гэты прадукт таннейшы.

— У вашым узросце я на цану б не глядзела, — павучае пакупніцу маладая распаўнелая прадавачка. — У вашым — лепей бы меней з'есці ды нечага добрага!

— А ты, відаць, так і робіш?! — пад напорам не губляецца «пані». — Скрылік сабе адрэжаш і спынішся?..

Гандлярка ў адказ толькі чырванее.

...І гады мае не чапай! — працягвае пакупніца. — Я да сваіх дажыла, а вось ты — яшчэ паспрабуй.

На гэтым «базар» скончыўся, жанкі «разышліся»: адна — нічога не купіла, другая — не прадала (пакуль). Але ж, можа, зразумела, што варта казаць, што — не?

### «ПОМНІК»

Паліц у той краме было нямала, але ж да той мы скіравалі адразу: кубкі стаялі — ну проста вачэй не адвесці: ладныя, цёмна-цёмна сінія, паверсе арнамент з дубовых лісткоў, унізе...

Унізе, на донцы, як варта чакаць, была паперынка з коштам. І ўражвала яна не менш.

А таму, цяжка ўздыхнуўшы, мы паставілі кубкі назад на палічку і ўжо адышлі да іншых, аднак думаць не перасталі, што якраз такіх вось кубкаў дома не хапала: гарбату пілі з малых, раз-пораз даліваючы, што, вядома ж, нязручна.

Якраз пагэтаму, пакружыўшы па краме, мы зноў вярнуліся да кубкаў, яшчэ раз пакруцілі ў руках і — была ні была! — купілі. Хоць два...

Адзін неўзабаве разбіўся, другі нам служыць дасёння, яшчэ і напамінам — аб пачатку сямейнага жыцця, аб безграшоўі і дэфіцыце, аб старой гаспадарчай краме на бабуліным рынку, якіх таксама даўно ўжо няма.

Хіба што ў памяці...

### «А В ОСТАЛЬНОМ, ПРЕКРАСНАЯ МАРКИЗА...»

На бюджэтную форму навучання Паліна не паступіла, вучыць яе на платным бацькі не ўзяліся: пайшла працаваць — прадавачкай у маленькую крамку, касіркай — у вялікую, афіцыянткай — у рэстаран.

Вось гэта (як потым казала) яе памылкай было, бо якраз тады спадабаліся лёгкія грошы і прыгожае жыццё, якраз там, маючы звычку ўсё заядаць, яна моцна папаўнела. Каб пахудзець, узялася курыць, убачыла, што марна, але кінуць ужо не змагла...

Да таго ж якраз там, у рэстаране, пазнаёмілася і на доўгіх 12 гадоў сышлася з хлопцам, які потым ажаніўся з іншай.

Зрэшты, жыццё ёсць жыццё. У кожнага яно сваё і кожнага хоць некуды ды выводзіць. Паліна атрымала-такі спецыяльнасць, знайшла работу і нават прызнанне: дырэктар не раз называў яе правай рукой... Што не магло не цешыць!

Але ж і для суму падстава была, бо з часам «рука» тая стала заўважаць, што нагружаюць яе ўсё больш, а вось плацяць — зусім не адпаведна.

Спачатку гэта проста здзіўляла яе і ціха абурала (бо няма ж справядлівасці!), а ўрэшце вывела з сябе: падала заяву на звальненне...

Спадзявалася, што яе, ну напэўна ж, не падпішуць, угавораць застацца. Аж не — тут жа звольнілі па пагадненні бакоў...

Стрэс яшчэ той быў: курыла цыгарку за цыгаркай, плакала, без снатворнага спаць не магла, паспрабавала выпіваць і паралельна (жыць жа за нешта трэба!) — шукаць сабе новую работу: рассылаць рэзюмэ, ездзіць да патэнцыяльных работадаўцаў...

Хоць гэта і без толку (прынамсі, пакуль), бо зараз на больш-менш прывабныя месцы не проста набіраюць спецыялістаў... Іх найперш выбіраюць — з ліку маладых, прыгожых, дыпламаваных, пажадана — здаровых (не знерваваных), без шкодных звычак.

У Паліны ўсё гэта было, але... даўно.

Што засталося?

Досыць яснае разуменне таго, што жыццё чалавека — ці не тая ж бегавая дарожка: прамарудзіш (не рванешся з месца ў кар'ер) альбо недзе адстанеш — і ўсё, потым не дагоніш, проста... не паспееш, бо кароткая дужа дыстанцыя...

Нідзе не дзелася і пачуццё гумару: ва ўсякім разе, на пытанне, як справы, Паліна адказвае сваім:

— Вам праўду сказаць?
— Пажадана.
— А мацюкацца можна?
— Не хацелася б...
— Тады — усё добра.

**Валянціна ДОЎНАР.**

# Усходні гараскоп на наступны тыдзень

**АВЕН.** Ваша самакрытычнасць і патрабавальнасць да сябе і навакольных дазволіць тварыць цуды ў плане працы, але пагражае сапсаваць адносіны з навакольнымі. Не шакуйце людзей сваёй прамалінейнасцю і залішняй рэзкасцю. У асабістым жыцці можа з'явіцца добры шанц штосьці змяніць, дадаць рамантыкі і пачуццёвасці.

**ЦЯЛЕЦ.** Звыклая і спакойная чарада падзей можа быць перапынена яркім, каб не сказаць — незвычайным, здарэннем. Праявіце творчую ініцыятыву і будзьце добразычлівыя ў адносінах з калегамі і сябрамі. Ваша рашучасць акажацца козырам і пойдзе на карысць. У выхадныя адпачывайце і не загружайце галаву думкамі аб працы.

**БЛІЗНЯТЫ.** На гэтым тыдні вас чакаюць прыемныя падзеі і рамантычныя неспадзеўкі ад каханага. Усе спрэчныя пытанні вырашацца на вашу карысць. На працы будзе камфортная, дзелавая абстаноўка, і вы зможаце праявіць свае найлепшыя прафесійныя якасці. У выхадныя прысвяціце час зносінам з бацькамі, у іх для вас ёсць вельмі слушная парада.

**РАК.** У панядзелак будзьце асцярожныя з новай інфармацыяй, верагодныя скажэнні, якія могуць увесці вас у зман. Тым, хто на працягу тыдня апынецца ўдалечыні ад дома, лепш пазбягаць малазнаёмых кампаній. Яшчэ не надышоў час для адпачынку, трэба прыкласці значныя намаганні для таго, каб праявіць сябе ў рабоце. У выхадныя звяртайце паменш увагі на хатнія праблемы, гэта можа прывесці да сварак.

**ЛЕЎ.** Падзеі тыдня могуць выклікаць засмучэнні і расчараванні. Аднак у выпадку асобных няўдач не варта адчайвацца, гэта толькі часовая з'ява. Аўторак будзе дастаткова напружаным і насычаным падзеямі. У сераду парада партнёраў і калег падкажа разумнае вырашэнне праблемы. У пятніцу смела бярыцеся за самыя цяжкія справы, але не спяшаецеся з ацэнкамі і каментарыямі. Суботу лепш правесці не дома.

**ДЗЕВА.** На гэтым тыдні асабліва добра будзе атрымлівацца звыклая, руцінная праца. Не варта гнацца за жураўлём у небе, сініца ў руках — таксама добра. Вельмі хутка лёс прапануе пайсці на абдуманую рызыку і дапаможа дабіцца поспеху. На працы назапасіліся пытанні, якія вырашыць пад сілу толькі вам, але не ўзвальвайце ўсё толькі на сябе, пашукайце памагатага. Вырашаючы свае праблемы, не забывайце пра інтарэсы блізкіх.

**ШАЛІ.** Поспех будзе залежаць ад умення хутка навучацца і прымяняць атрыманыя веды на практыцы. Начальства дапаможа ў дасягненні пастаўленай мэты, але яна павінна быць рэальнай. Станеце больш адчувальныя да меркавання навакольных. Не чапляйцеся за мінулае, лепш шукайце новае, асабліва гэта датычыцца асабістага жыцця. У пятніцу будзьце асцярожныя ў выказваннях, не правакуйце канфліктную сітуацыю. У выхадныя верагодная дапамога з боку сваякоў.

**СКАРПІЁН.** Вам даўно трэба прыняць важнае рашэнне і змяніць жыццё да лепшага. Зоркі раяць прыслухацца да меркавання каханага. Асабістая сфера, каханне і клопат зараз надзвычай важныя для вас. Пазбаўцеся ад старога і непатрэбнага. Канфлікты могуць быць выкліканы вашай запальчывасцю і жаданнем рабіць усё па-свойму. Поспех верагодны ў людзей творчых прафесій, а таксама ў юрыстаў, іх праца атрымае прызнанне, а папулярнасць павялічыцца.

**СТРАЛЕЦ.** У найбліжэйшыя дні не выключана дастаткова рэзкая змена дзейнасці. Пры гэтым зусім не абавязковая змена працы, проста з'явіцца іншая тэма ці нават цэлы кірунак. Прыміце дапамогу калег, яна будзе вельмі дарэчы. У канцы тыдня адчуеце пазітыўныя перамены. Замест напружання прыйдзе лёгкасць, у справах адкрыецца другое дыханне. У выхадныя могуць раскрыцца таямніцы вашага даўняга мінулага.

**КАЗЯРОГ.** Давядзецца выбудоўваць адносіны з кіраўніцтвам і прадстаўнікамі афіцыйных інстанцый. Удасца заручыцца іх падтрымкай — лічыце, што справа ў капелюшы. Могуць узнікнуць цяжкасці з-за таго, што давядзецца праводзіць рашучыя меры і пераканаць многіх у іх неабходнасці. Звярніце ўвагу на тое, як вы распараджаецеся сваім часам, магчыма, знойдзеце спосаб яго сэканоміць. У асабістым жыцці будзьце больш мяккімі і рамантычнымі.

**ВАДАЛІЎ.** З'явяцца новыя планы і ідэі, якія дадуць магчымасць рэалізаваць ваш творчы патэнцыял. У панядзелак займіцеся тым, што трэба асабіста вам, а не каму-небудзь. У сераду не варта дэманстраваць прафесіяналізм і доказваць сваю незаменнасць, лепш сысці ў цень. Хатнія справы ў выхадныя могуць адабраць практычна ўвесь вольны час, але раздражняльнасць і сваркі справе не дапамогуць. Старайцеся захоўваць спакой і выконваць толькі тыя абавязкі, якія сапраўды лічыце сваімі.

**РЫБЫ.** Будзеце поўныя энергіі і гатовыя да новых прыгод, але варта памятаць, што ваша свабода заканчваецца на мяжы са свабодай іншага чалавека. Спроба захапіць права дзейнічаць па ўласным жаданні хутка прывядзе вас да сур'ёзнага канфлікту ў сям'і. Не выключаны разрыў адносін ці нават развод. Зрэшты, магчыма, вам даўно час пачаць штосьці новае. У суботу чакайце навін ад далёкіх сваякоў, яны здольныя вам дапамагчы ў вырашэнні нейкай важнай праблемы.

Даты | Падзеі | Людзі

**15 КРАСАВІКА**

У краіне

**1913** год — нарадзіўся Міхаіл Сідаравіч Пруднікаў, удзельнік партызанскага руху ў Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза (1943), генерал-маёр. З 1941-га быў камандзірам батальёна асобага прызначэння, з сакавіка 1942-га — у Полацкім раёне, камандзір спецыяльнага атрада, пасля партызанскай брыгады «Няўлоўныя». Аўтар кніг «Няўлоўныя», «Няўлоўныя» дзейнічаюць», «Асаблівае заданне».



**1918** год — нарадзіўся Георгій Ціханавіч Кавалеўскі, беларускі эканаміст, кандыдат эканамічных навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Беларусі. Аўтар навуковых прац па праблемах таварна-грашовых адносін.

**1938** год — нарадзіўся Генадзь Мікалаевіч Мураўёў, беларускі вучоны ў галіне анкалогіі, доктар медыцынскіх навук, прафесар. Аўтар навуковых прац па анкалогіі і анкамарфалогіі.

**1958** год — нарадзіўся Леанід Уладзіміравіч Маракоў, беларускі пісьменнік, журналіст. Аўтар шэрагу кніг, сярод якіх — «Трое», «100 мініяцюр».

У свеце

**1793** год — нарадзіўся Васіль Якаўлевіч Струвэ, расійскі астраном, адзін з заснавальнікаў зорнай астраноміі, член Пецярбургскай акадэміі навук (1832), першы дырэктар Пулкаўскай абсерваторыі, член-заснавальнік Рускага геаграфічнага таварыства.

**1923** год — нарадзіўся Мікіта Ільіч Талстой, рускі мовазнаўца. Праўнук Льва Талстога. Даследаваў гісторыю славянскіх літаратурных моў, славянскую дыялекталогію, тапаніміку і этнаграфію. Унёс значны ўклад у стварэнне этналінгвістыкі як самастойнай галіны філалогіі. Пад яго ўплывам узніклі цэлыя школы этналінгвістаў у многіх расійскіх гарадах, а таксама ў Мінску, Гомелі, Мазыры. У 1968—1981 гг. арганізаваў і ўзначаліў шматгадовыя комплексныя экспедыцыі на Палессе, вынікам якіх стала стварэнне фундаментальнага Палескага этналінгвістычнага архіва ў Інстытуце славяназнаўства і балканістыкі Расійскай акадэміі навук. У сваіх навуковых працах шырока выкарыстоўваў беларускі матэрыял. Рэдактар і суаўтар зборнікаў «Лексіка Палесся...» і «Палессе (Лінгвістыка. Археалогія. Тапаніміка)».



**1933** год — нарадзіўся Барыс Натанавіч Стругацкі, расійскі пісьменнік-фантаст. У суаўтарстве з братам Аркадзем Стругацкім напісаў навукова-фантастычныя апавяданні «Цяжка быць богам», «Панядзелак пачынаецца ў суботу», «Пікнік на абочыне» і інш.

У гэты ж год нарадзілася Клаўдыя Кардынале, італьянская кінаактрыса.

Так гаварыў...

**ІОСІФ БРОДСКІ:**

*«Выратаваць свет, напэўна, ужо не ўдасца, але асобнага чалавека — заўсёды можна».*

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.10 | 20.11 | 14.01 |
| Віцебск — | 5.57 | 20.03 | 14.06 |
| Магілёў — | 6.00 | 20.01 | 14.01 |
| Гомель — | 6.00 | 19.54 | 13.54 |
| Гродна — | 6.25 | 20.25 | 14.00 |
| Брэст — | 6.29 | 20.22 | 13.53 |

### Месяц

***Апошняя квадра 13 красавіка. Месяц у сузор'і Вадаліва.***

### Імяніны

***Пр.** Палікарпа, Ціта.*
***К.** Анастасіі, Базыля, Вацлава, Цэзара.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




### УСМІХНЕМСЯ

У панядзелак кідаў піць... Настала пятніца — зразумеў, што недакінуў.

**— Я, вядома, разумею, што ў кожнай дзяўчыне павінна быць «разыначка», але з цябе хоць кампот вары!**

— Колькі вам гадоў?
— Мне бліжэй да трыццаці, чым да дваццаці пяці.
— А дакладней?
— Пяцьдзясят пяць.




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
для зваротаў: zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 11.432. Індэкс 63850. Зак. № 866.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 14 красавіка 2023 года.